ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

Адрэс РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Менск, Пляц Волі № 17. 1-шы паверх. Тел. Сакратара Рэдактара — № 769, Рэдактара — № 244, Канторы — № 244, Сакратара праміслова-сялянскі — № 615

XI ГОД ВЫДАННЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 19 (3108) СУБОТА 24 СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

МІЛЬЯРД ПЯЦЬДЗЕСЯТ МІЛЬЕНАЎ РУБЛЕЎ—

НА КАЛГАСНАЕ І МАШЫНА-ТРАКТАРНАЕ БУДАЎНІЦТВА

120 тысяч трактараў, 7 тысяч грузавых і лёгкавых аўтамабіляў

Па-бальшавіцку ўзяцца за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мабілізаваць усе сілы, стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць тым самым рашаючыя посьпехі ў справе калектывізацыі і на гэтай аснове ліквідацыі кулацтва як клясы

За сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі!

Да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, кааперацыйных, калгасных і камсамольскіх арганізацый

Зварот СНК і ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі яравых пасеваў у 1931 годзе

Перавыкананьне за мінулыя 2 гады заданьняў пяцігадовага плану, асабліва па галінах цяжкай індустрыі і вытвор часьці сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, дае магчымасьць савецкай уладзе ў трэцім годзе пяцігодкі шчэ больш павялічыць супроць папярэдняга год укладаньні ў сельскую гаспадарку і ўзмацніць, такім чынам, дапамогу дзяржавы вёсцы на справу калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ажыцьцяўленьня задачы ліквідацыі кулацтва як клясы. У адпаведнасьці з гэтым і ў сувязі з надыходзячай кампаніяй па кантрактацыі яравых пасеваў СНК СССР і ЦК УсеКП(б) лічаць неабходным правядзеньне наступных асноўных мерапрыемстваў:

1. Меры дапамогі дзяржавы сельскай гаспадарцы

1) Накіраваць у сельскую гаспадарку на працягу 1931 г. 120.000 трактароў (у пераводзе на 10-мільны трактар) агульным коштам 200 мільёнаў рублёў.

2) Замест існуючых 360 машынатрактарных станцый, арганізаваць на працягу 1931 г. 1.040 новых машынатрактарных станцый з агульным трактарным паркам 980.000 цягавых сіл з тым, каб увесну 1931 году працавала 1.105 машынатрактарных станцый з трактарным паркам у 692.000 сіл, якія забясьпечваюць пасеў машынатрактарным паркам 980.000 цягавых сіл з ёнаў гектараў, замест 4 мільёнаў гектараў у мінулым годзе. Накіраваць на капітальнае будаўніцтва машынатрактарных станцый у 1931 г. 540 мільёнаў рублёў.

3) Падвоіць у 1931 годзе забясьпечаньне сельскай гаспадаркі сельскагаспадарчымі машынамі супроць 1930 г. (768 мільёнаў рублёў замест 400 мільёнаў руб., у тым ліку на 157 мільёнаў руб. уборачных машын). Накіраваць асноўную частку гэтых машын у калгасы і машынатрактарныя станцыі па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах. Забясьпечыць сельскую гаспадарку да вясны машынамі на суму 370 мільёнаў руб.

4. Накіраваць у сельскую гаспадарку 7.000 грузавых і лёгкавых аўтамабіляў, у тым ліку ня менш 2.000 машынатрактарным станцыям.

5. Забясьпечыць сельскую гаспадарку ў 1931 г. мінэральнымі ўгнаеньнямі ў колькасьці 24 млн. цэнтнераў (145 млн. пуд.) на суму 105 мільёнаў руб., у тым ліку да вясны—13 мільёнаў цэнтнераў (78 мільёнаў пуд).

6. Забясьпечыць сельскую гаспадарку сродкамі барацьбы са шкоднікамі да сэзону на суму 40 млн. руб. замест 19 млн. руб. у леташнім годзе.

7. Для забясьпечаньня росту ўраджаю ў калгасах адпусьціць 21 млн. цэнтнераў (126 млн. пуд.) гатунковага і палепшанага насеньня, у тым ліку: зернавога 11.500 тыс. цэнтн., кукурузы—600.000 цэнтн., сланечніку — 500.000 цэнтн., бабовых—1.100 тыс. цэнтн., соі—250.000 цэнтн., сахарнай свёклы—430.000 цэнтн., ільну-дўгунка—760.000 цэнтн., ільну-кудрашы — 120.000 цэнтн., канапель—310.000 цэнтн., насеннай бульбы—2.500 тыс. цэнтн., бавоўны—1,600 тыс. цэнтн., супроць 1.300 тыс. цэнтн. і інш. 1.300 тыс.

Фонд гатунковага зернавога стварыць з дзяржсорфонду ў разьмерах 4,1 млн. цэнтн. і тавара-гатунковых з цэнтралізаваных заготовак у разьмерах 7,4 млн. цэнтн. З агульнай сумы зернавога гатунковага насеньня (11.500 тыс. цэнтн.) адпусьціць у парадку абмену на радавое зерне 10.900 тыс. цэнтн., і без абмену 600.000 цэнтн. насеньня дзяржсортфонду ў парадку кантрактацыі са зваротам увосені. Пры выдачы пасеўшчыкам насеньня надбаўка на заготоўчыя цэны гатунковага палепшаньня насеньня не павінна перавышаць 15 проц.

8. Саўгасам Зернатрэсту аказаць дапамогу калгасам шляхам воснавога ўзораваньня калгасам ня менш 500.000 гектараў і засеву ня менш 500.000 гектараў. Узмацніць усе іншыя віды дапамогі саўгасаў калгасам (аградапамога, скарыстаньне сельска-гаспадарчых машын, рамонт, падрыхтоўка кадраў і г. д.).

9. Адпусьціць для калгасаў і машынатрактарных станцый 1.050.000.000 руб. на бюджэце і доўгатэрміновым крэдыце.

10. Апроч усіх вышэйпаказаных мерапрыемстваў, абавязаць Дзяржбанк адпусьціць для гарэшчага авансаваньня пасеўнікаў, кантрактуючых прадукцыю сваёй вытворчасьці, 355 млн. руб. на усе культуры (як таварныя, так і насенныя), асноўная частка якіх павінна быць адпушчана ў пэрыяд апрацоўкі і перад уборкай. Усе гэтыя ўкладаньні павінны забясьпечыць вялізарны рост тэхнічнага ўзбраеньня і матэрыяльнай базы разгортваючагося калгаснага руху і павялічыць тым самым сыравінныя і харчовыя рэсурсы краіны.

Ставячы задачай карэнным чынам палепшыць на гэтай аснове забясьпечаньне прамысловасьці сыравінай і працоўных харчамі, абавязаць Наркамзем СССР правесьці праз сельскагаспадарчую кампэрацыю; Калгасцэнтр, Трактарцэнтр і Насенняводкалгасцэнтр, кантрактацыю яравых пасеваў 1931 г. на наступных падставах:

2. На зернавых і масьлічных культурах

1) Устанавіць цэны кантрактацыі зернавых і масьлічных культур па калгасах і бядняцка-серадняцкіх адзіначасобных гаспадарках у разьмеры 58 мільёнаў гектараў, у тым ліку праз Хлебацэнтр 39.500 тыс. гектараў, Трактарацэнтр—15.500 тыс. гект. праз Насенняводкалгасцэнтр—3 млн. гектараў сартавых пасеваў для сартавой рэпрадукцыі.

На культурах кантрактацыю правесьці: зернавых—51 млн. гект., сланечніку—4.430 тыс. гект., соі—400.000 гект., бабовых—2 млн. гект., рысу 170.000 гект.

2) Апроч адпускаемых машын і вытворчых крэдытаў адпусьціць для гарэшчага авансаваньня пракатных культур 40 млн. руб., у тым ліку: для сланечніку 9 млн. руб., для кукурузы—10 млн. руб., для соі—6 мілн. руб., для іншых бабовых—9 млн. руб., для рысу—6 мілн. руб.

Выдачу авансаў праводзіць перад акучкай і прапашкай.

Пры здачы сланечніку і соі забясьпечыць выдачу за наяўны разьлік калгасам для іх членаў па 4 кгр. расьліннага масла і па 8 кгр. жмыхі на кожны цэнтнер; адзіначасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам—па 3 кгр. расьліннага масла і 6 кгр. жмыхі за кожны здадзены цэнтнер сланечніку і соі.

3. Па бавоўне

1) Закантрактаваць увесь ураджай бавоўны-сыравіны калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на 1931 г. ў колькасьці 19 млн. цэнтнераў.

2) Дадаткова да існуючых у бавоўняных раёнах 19 машынатрактарных станцый, арганізаваць у 1931 г., 130 машынатрактарных станцый з трактарным паркам у 125 тыс. конскіх сіл, у тым ліку да вясны 118 машынатрактарных станцый з акопам імі 1.200.000 гектараў бавоўняных пасеваў.

3) Завесьці ў бавоўняныя раёны да сэзонных работ 48 тысяч бавоўняных сеялак, у тым ліку 11.000 чатырох і двурадных; 65 тыс. культыватараў, у тым ліку 2.000 трактарных; 23 тыс. абсьпрыскаў і 1.000 бавоўна-уборачных машын.

4) Адпусьціць у 1931 г. бавоўняным калгасам і бядняцка-серадняцкім адзіначасобным бавоўняным гаспадаркам па ўстаноўленых дзяржаўных танных цэнах 8.200.000 цэнтнераў (50 мілн. пуд.) хлеба, 1.600 тыс. цэнтн. (10 млн. пуд.) зерня-фуража, пакінуць норму выдачы хлеба на гаспадарку ў ступені залежнасьці ад дакладнасьці апрацоўкі бавоўняных палёў і колькасьці здаваемай дзяржаве бавоўны

5) Завесьці ў бавоўняныя раёны для продажу бавоўнагадоўчым гаспадаркам у 1931 г. прамысловых тавараў на суму ня менш 250 млн. руб. з тым, каб яны былі праданы бавоўнагадоўчым гаспадаркам у парадку нармальнага тавараазароту па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах.

6) Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў бавоўны 100 млн. руб. з выдачай 20 проц. ад гэтай сумы перад пасевам, 30 проц.—перад першай акучкай і 50 проц.—перад трэцяй акучкай, прычым выдача перад трэцяй акучкай робіцца толькі ў тым выпадку, калі выкананы першыя дзьве акучкі.

7) Выдаць пасеўшчыкам бавоўны беспроцантны крэдыт 1.800. тыс. цэнтн. мінэральнага ўгнаеньня з пакрыцьцем кошту ўгнаеньня ва ўстаноўленыя тэрміны.

8) Выдаць пасеўшчыкам пасеўнае насеньне ў колькасьці, якая поўнасьцю пакрывае ўсю патрэбу (1.600 тыс. цэнт.) у парадку кантрактацыі.

4 Па бураках

1) Закантрактаваць усю плошчу пасеваў цукровых буракоў у калгасах і бядняцка-серадняцкіх адзіначасовых гаспадарках у колькасьці 1.200 тыс. гектараў.

2) Арганізаваць у раёнах па вырашчаньні буракоў 150 машынатрактарных станцый, у тым ліку 120 машына-трактарных станцый з акопам 375.000 гектараў буракоў.

3) Давесьці ў раёны па вырошчваньні буракоў для продажу пасеўшчыкам цукровых буракоў прамысловых тавараў на суму ня менш 60 млн руб. з тым, каб яны былі праданы ў гаспадаркі па вырошчваньні буракоў у парадку нармальнага тавараазароту па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах.

4) Захаваць у 1931 г. устаноўленую для мінулага году выдачу датацый за кожны здаваемы цэнтнэр буракоў бясплатна 58 кілёграм жому і 1,5 кгр. патакі ў кошт платы за буракі 60 грам цукру.

5) Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў буракоў 41 млн. руб. з тым, каб у дадатак ужо выдаваемым 25 проц. гэтай сумы 50 проц. яе было выдана ў часе апрацоўкі і 25 проц. перад уборкай.

6) Выдаць калгасам і бядняцка-серадняцкім адзіначасовым гаспадаркам, якія засяваюць буракі, мінэральныя ўгнаеньні (супэрфасфат) у беспроцантны крэдыт па 2 цэнтнеры на кожны гектар з пакрыцьцем кошту угнаеньня ва ўстаноўленыя тэрміны і бясплатна бураковае насеньне па 32 кгр. на кожны гектар.

Па ільну і канаплях

1) Закантрактаваць пасевы ільну і канапель ў калгасах і бядняцка-серадняцкіх адзіначасовых гаспадарках у наступным разьмеры: па ільну-даўгунцу на валакно і семя — 1.950 тыс. гект., па ільну-кудрашу на семя—400 тыс. гектараў, па канаплях па валакно і семя —700 тыс. гектараў.

2) Арганізаваць у ільнаводных раёнах на працягу 1931 г. 150 машынатрактарных станцый з трактарным паркам у 75.000 сіл з тым, каб да вясны было арганізавана 77 машынатрактарных станцый з трактарным паркам у 38.500 сіл з акопам 280 тыс. гектараў пасеву ільну.

3) У папаўненьне да існуючых 38 ільняных і ільняковых заводаў па першапачатковай апрацоўцы, пабудаваць у 1931 годзе 489 новых заводаў, аканапляводчых імі ўсе ільнаканапляводныя саўгасы, машынатрактарныя станцыі і пункты, у якіх намячаецца будаўніцтва машынатрактарных станцый ў 1932 годзе.

Абавязаць ВСНГ СССР прадзьвесьці ў 1931 г. 600 камплектаў машын для абсталяваньня гэтых заводаў і 10.000 шт. ільнацерабілак, у тым ліку да 1-га верасьня 4.500 штук.

4) Адпусьціць да вясны 1931 году ільнаканапляводчым калгасам 1.500 тыс. цэнтнэраў мінэральных угнаеньняў з пакрыцьцем кошту ва ўстаноўленыя тэрміны.

5) Забясьпечыць правядзеньем пасеву ільну і канапель ў новых раёнах і пашырэньне пасеўных плошчаў у старых раёнах выдачай у парадку кантрактацыі насеньня ільна-даўгунцу ў колькасьці 760.000 цэнтн., ільна-кудрашу—120.000 цэнтн. і канапель — 310.000 цэнтн.

6) Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў ільну і канапель 60 млн. р., з якіх 40 проц. выдацца перад пасевам і 60 проц. перад уборкай.

7) У ільнаводных і канапляводных раёнах спажываючай паласы і неўзнавых раёнах вытворчай паласы, выдаць пасеўшчыкам ільну і канапель 1,25 цэнтн. хлеба, супроць 1 цэнтн. ада ваемага валакна з тым, каб да веснавога пасеву ў лік гэтай нормы было выдадзена па ½цэнтн. на гектар (усяго 5,3 млн. пуд. хлеба ўвесну).

8) Захаваць у 1931 г. забясьпечаньне здатчыкаў насеньня ільну і канапель расьліцельным маслам і жмыхамі па нормах 1930 г. (7 клгр. масла і 10 кгр. жмыхаў, супроць 1 цэнтн. ільнанасеньня для калгасаў; 5/7 клгр. масла і 8 кгр. жмыхаў для адзіначасовікаў).

9) Аслабяняюцца ад звычайных норм здачы хлеба ўраджаю 1931 г. калгасы і адзіначасовыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ільна-канапляводных раёнаў спажываючай і ў незярнавых раёнах вытворчай паласы пры ўмове пасеву гэтымі гаспадаркамі ня менш 10-15 пр. зерня, або ня менш 5-7 проц. канапель ад агульнай пасеўнай плошчы і пры абавязковым выкананьні імі задач ільну па кантрактацыйных дагаворах.

10) Завесьці ў ільнаканапляводчыя раёны для продажу пасеўшчыкам ільну і канапель 1931 г. прамтавараў на суму ня менш 100 млн. руб з тым, каб яны былі праданы пасеўшчыкам у парадку нармальнага тавараазароту па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах.

Разьмеры кантрактацыі па іншых культурах і насеньнях вызначыць Наркамзему СССР і Наркамснабу СССР у двухдзённы тэрмін.

Даручыць Наркамснабу і Наркамзему СССР на аснове гэтых паказаньняў зацьвердзіць тыповыя дагаворы на кантрактацыі.

СНК СССР і ЦК УсеКП(б) заклікаюць усе партыйныя, савецка-гаспадарчыя, кааперацыйна-калгасныя і камсамольскія арганізацыі ўзяцца па-бальшавіцку за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мабілізаваць усе сілы і растлумачыць масам рабочых і сялян значэньне правадзімых савецкай уладай захадаў па тэхнічным пераўзбраеньні і калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Старшыня СНК СССР
Молатаў (Скрабін).
Сакратар ЦК УсеКП(б) **І. Сталін.**
21-га студзеня 1931 г.

Ленінскія дні за рубяжом

Дзень сьмерці Леніна ў фашысцкай Польшчы

Дэманстрацыі ў Варшаве і Лодзі

ВАРШАВА, 23. У дзень сьмерці Леніна, Любкнэхта і Люксембург у Варшаве адбыліся 4 масавых дэманстрацыі пралетарыяту. Дэманстрацыі ўсюды былі разагнаны.

У Лодзі ў рабочых раёнах гораду і каля біржаў працы таксама адбыліся дэманстрацыі рэвалюцыйных рабочых. Камуністычнаму дэпутату тав. Данецкаму ўдалося пранікнуць у памяшканьне біржы працы і выступіць перад бес працоўнымі з прамовай. Аднак, наляцеўшая паліцыя зьбівае рабочых ра загнала мітынг.

Баявыя дэманстрацыі памяці Леніна ў Канадзе

ЛЁНДАН, 22-І. У Ванкувэры (Канада) паліцыя забараніла арганізацыю дэманстрацый у дзень гадавіны сьмерці Леніна. Аднак рабочыя парушылі гэтую забарону і арганізавалі шматлюдную дэманстрацыю.

Конная і пешая паліцыя напала на дэманстрантаў зьбіваючы іх пажамі, прычым рад рабочых было параненых.

Справа Леніна жыве!

ПАРЫЖ, 22-І. У артыкуле ў «Юманітэ», напісаным да дня Ленінскіх дзён, тав. Кашэн, нагадваючы аб мітынгу, скліканым у Парыжы, піша: «Нягай вадаюць усе, хто прыдзе на гэты мітынг, што справа Леніна не закончана, што яна працягваецца ў СССР з буйным посьпехам над кіраўніцтвам лепшага вучня Леніна.

Няхай яны ведаюць, што Сталін кіруе справаю вялікага Леніна з вялікай цьвёрдасьцю, партай таго, каго зараз ужо няма ў жывых. Няхай яны ведаюць у асаблівасьці, што яны самі пазбаўлены ў сваю чаргу ўступіць на верныя і слаўны шлях падрыхтаваны перакасьмяротным геніям Уладзімера Ільліча».

Водгукі па справе замаху на прадстаўніцтва СССР у Варшаве

ВАРШАВА. 18-І. Газэта «Пшэгляд Вячорны» паведамляе, што сьледства па справе арганізатара замаху Палянскага які рыхтаваў выбух пяклельнай машыны пад памяшканьнем паўпаўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве ўжо скончана.

Матэрыялы сьледства перададзены для складаньня абвінавачэньня аку намесьніку пракурора Нісенсону, які ў свой час абвінавачваў белагвардзейца Вайцахоўскага, што рабіў замах на гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Польшчы тав. Лізарава. Працэс Палянскага адбудзецца ў сярэдніне лютага. Палянскі запрасіў у якасьці абаронцы Варшаўскага адваката Скачыньскага.

Чарговая антысавецкая выдумка польскіх палітыкаў

БЭРЛІН, 17-І. Польскі друк агаласіў выдуманае паведамленьне, паводле якога СССР ня выканаў, нібы сваіх абавязацельстваў у адносінах Данцыгскіх суднабудаўнічых верфей.

Дзякуючы таму, што СССР ня выкупіў, нібы, сваіх вэксэляў, адна буйная данцыгская фірма была, згодна польскіх паведамленьняў, прымушана звольніць сваіх рабочых.

У сувязі з гэтымі паведамленьнямі адзел друку Данцыгскага сэнату агаласіў наступную заяву: «Гэта паведамленьне ні ў якай ступені не адпавядае сапраўднасьці. Тэндэнцыёзныя фальшывыя польскіх паведамленьняў вельмі відавочна для таго, каб гэтыя паведамленьні маглі пагаршаць эканомічныя адносіны паміж СССР і Данцыгам».

Саюз інтэрвэнтаў

ВЕНА, 16-І. У сувязі з падпісаньнем у Жэнэве згоды аб прадоўжаньні ваеннага дагавору «Нэйес Вінэр Экстраблят» піша «Ваз сумненьня гэты ваенны саюз у першую чаргу накіраваны супроць СССР».

Місыянэры аб кітайскай Чырвонай арміі

ПАРЫЖ, 20-І. Газэта «Пці-Парызьен» публікуе інтэрв'ю свайго шанхайскага карэспандэнта з двума каталіцкімі місыянэрамі, якія былі ў палоне ў кітайскіх чырвонаармейцаў.

Місыянэры заяўляюць, што яны выкі зьмешчаны ў шпіталі, дзе з іх вельмі добра абыходзіліся. Апісваючы дысцыплінаванасьць чырвонаармейскіх атрадаў, місыянэры заяўляюць, што пры эвакуацыі чырвонымі часьцямі гарадоў альбо вёсак насельніцтва звычайна ідзе ў горы разам з чырвонымі. Таму панкінскія салдаты адчуваюць вялікія труднасьці з харчамі ў заняцемых раёнах.

* * *

БЭЙПІН, 17-І. Японскае агэнцтва Сымбун Рэнга публікуе звесткі, атрыманыя ад некалькіх вёраў грамадзкіх дзеячоў, занятых вывучэньнем становішча ў правінцыі Хунань.

Гаворачы аб раёнах, занятых кітайскімі чырвонымі арміямі, агэнцтва заяўляе, што колькасьць чырвонаармейцаў у гэтай правінцыі дасягае 100.000 чал. У змаганьні з панкінскім войскам чырвонаармейцы ўжываюць пасьпяховыя мэтады партызанкі. Далей агэнцтва адзначае, што ў шмат якіх мясцох насельніцтва вітае прыход чырвонай арміі.

Нацыянал-апартуністаў—агэнтаў нацдэмаўскай контррэвалюцыі,

рупараў клясавага ворага, здраднікаў партыі—Ігнатоўскага і Жылуновіча—вон з радоў КП(б)Б

„... Погляды нацыянал-апарністаў несумяшчальны з прыналежнасьцю да КП(б)Б

(З рэзалюцыі Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б)

Пастанова Прэзыдыуму і Парткалегіі ЦК ККП(б)Б ад 16 студзеня 1931 г.

Па справе т. Ігнатоўскага У. М.

Ігнатоўскі, Усевалод Макараў, г. н. 1881, член КП(б)Б з ліпеня 1920 г., беларус, па сацыяльным паходжаньні—бацька настаўнік, а потым сьвяшчэньнік; па сацыяльным становішчы—інтэлігент, асьвета вышэйшая (вучыўся ў духоўнай школе, потым скончыў у даваенны час унівэрсытэт)—прафэсар БДУ па катэдры гісторыі Беларусі; у старой, белай і Чырвонай арміях ня служыў; у іншых партыях быў — у партыі с.-р. 19 год (з 1901 па 1918 г. у партыі расійскіх сац.-рэвалюцыянэраў, а з 1918 году па 1920 год у партыі бел. с.-р., быў членам ЦК апошніх) і 6 мес. так зв. Беларускай камуністычнай арганізацыі да ліпеня 1920 г.

За час прабываньня ў КП(б)Б займаў рад адказных савецкіх пасад у БССР, як-та: у 1920 г. НКЗем БССР, потым Асьветы, старшыня Інбелкульту і потым Прэзыдэнт Акадэміі Навук).—Ігнатоўскі, замест партыйнага кіраўніцтва і забясьпечаньня правядзеньня лініі партыі ў рабоце гэтых органаў, служыў шыльдай для прыкрыцьця варожай справе пралетарыяту работы і сродкам антысавецкіх плячаў нацдэмаўскіх контр - рэвалюцыйных элемэнтаў і ператварэньне БАН у плацдарм для контр - рэвалюцыйных дзеяньняў нацдэмаўскай арганізацыі і г. д.), выконваючы ў культурна-нацыянальным будаўніцтве ролю кулацкага ідэйнага, аналёгічную ролю Прыгчэпава ў зямельных органах.

4) Прымаючы ўдзел у так званых сямейных вечарох, якія наладжваліся контр-рэвалюцыйнай групай нацыянал-дэмакратаў, насілі на самой справе палітычны характар і служылі мэтам нацдэмаўскай контр-рэвалюцыйнай работы (здабываньне ўсялякага роду зьвестак аб важнейшых пастановах савецкіх і партыйных органаў, расстаноўка нацдэмаўскіх сіл у розных установах, распалажэньне да сябе кіруючых партыйных і савецкіх кадраў і г. д.)—Ігнатоўскі ня толькі трацію свой палітычны тавар члена партыі і члена Бюро ЦК, ня толькі не даваў адпору адбываўшымся антыпартыйным і антысавецкім гутаркам, але і сам прымаў удзел у гэтым і часта рэзаглашаў ім сакрэтныя пастановы партыі і савецкіх органаў.

Больш таго, меў сувязь з пасобнымі заўбежнымі нацыянал-дэмакратамі і фашыстамі, выдучы з імі гутаркі на сутнасьці контр - рэвалюцыйнага характару, заахвочваючы (поощряя) і выслухаючы іх на антысавецкія выступленьні.

Такога роду дзеяньні Ігнатоўскага [illegible] нацдэмаўскай контр - рэвалюцыйнай работы ў БССР, яго служылі інтарэсам міжнароднай контр-рэвалюцыі і нанесьлі вялікую шкоду партыі і дыктатуры пралетарыяту.

Больш таго, з палітычнаю мэтаю, ва ўгоду беларускаму нацыяналізму і падвышэньня рэвалюцыйных заслуг сваіх і сваёй групы (Беларускай камуністычнай арганізацыі) Ігнатоўскі ня брэзгаваў фальсіфікаваць гістарычныя факты, затушоўваючы сапраўды партызанскі рух пад кіраўніцтвам КП(б)Б у пэрыяд польскай акупацыі тэндэнцыйна адлюстроўваючы ролю мінмага партызанскага руху, былым кіраўнікам ня і яго групай, у той час, як у сапраўднасьці гэтага ня было.

3) У сваёй практычнай дзейнасьці на адказных пастах (НКАсьветы, старшыня Інбелкульту і потым Прэзыдэнт Акадэміі Навук)—Ігнатоўскі, замест партыйнага кіраўніцтва і забясьпечаньня правядзеньня лініі партыі ў рабоце гэтых органаў, служыў шыльдай для прыкрыцьця варожай справе пралетарыяту работы і сродкам антысавецкіх плячаў нацдэмаўскіх контр - рэвалюцыйных элемэнтаў і ператварэньне БАН у плацдарм для контр - рэвалюцыйных дзеяньняў нацдэмаўскай арганізацыі і г. д.), выконваючы ў культурна-нацыянальным будаўніцтве ролю кулацкага ідэйнага, аналёгічную ролю Прыгчэпава ў зямельных органах.

4) Прымаючы ўдзел у так званых сямейных вечарох, якія наладжваліся контр-рэвалюцыйнай групай нацыянал-дэмакратаў, насілі на самой справе палітычны характар і служылі мэтам нацдэмаўскай контр-рэвалюцыйнай работы (здабываньне ўсялякага роду зьвестак аб важнейшых пастановах савецкіх і партыйных органаў, расстаноўка нацдэмаўскіх сіл у розных установах, распалажэньне да сябе кіруючых партыйных і савецкіх кадраў і г. д.)—Ігнатоўскі ня толькі трацію свой палітычны тавар члена партыі і члена Бюро ЦК, ня толькі не даваў адпору адбываўшымся антыпартыйным і антысавецкім гутаркам, але і сам прымаў удзел у гэтым і часта рэзаглашаў ім сакрэтныя пастановы партыі і савецкіх органаў.

Больш таго, меў сувязь з пасобнымі заўбежнымі нацыянал-дэмакратамі і фашыстамі, выдучы з імі гутаркі на сутнасьці контр - рэвалюцыйнага характару, заахвочваючы (поощряя) і выслухаючы іх на антысавецкія выступленьні.

Такога роду дзеяньні Ігнатоўскага [illegible] нацдэмаўскай контр - рэвалюцыйнай работы ў БССР, яго служылі інтарэсам міжнароднай контр-рэвалюцыі і нанесьлі вялікую шкоду партыі і дыктатуры пралетарыяту.

6) Ігнатоўскі за ўвесь час прабываньня свайго ў партыі всёў групавую барацьбу супроць правільнай нацыянальнай палітыкі партыі, прапісгаўляючы ёй сваю нацыяналістычную лінію, групуючы вакол сябе нацыяналістычна настроеныя элемэнты ў КП(б)Б, выхадцаў з дробна-буржуазнага асяродзішча, апіраючыся ў сваёй барацьбе з партыяй на нацдэмаўскую контр - рэвалюцыйную інтэлігенцыю.

У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня ўплыву нацыяналістычных элемэнтаў у радох КП(б)Б—Ігнатоўскі падбіраў найбольш блізкіх свайму светапогляду людзей, з мэтаю прасоўваньня іх у розныя савецкія і нават партыйныя органы.

Акрамя таго, Ігнатоўскі пераносіў групавую барацьбу таксама і ў рады КП(б)Б супроцьстаўляючы і там нацыянальна настроеныя элемэнты правільнай лініі партыі.

7. На працягу свайго прабываньня ў КП(б)Б Ігнатоўскі, пад націскам партыі ня раз прызнаваў свае памылкі і антыпартыйныя і антыпралетарскія ўстаноўкі, кожны раз абяцаючы выправіць іх і не паўтарыць. Аднак, як гэта з відавочнасьцю ўстаноўлена ў сучасны момант, што ня гледзячы на свае запэўніваньні і прызнаньні перад партыяй,—працягваў фактычна нацыянал-апартуністычную дзейнасьць, уводзіў партыю ў зман і тым самым ашукваў і здраджваў партыі.

На падставе гэтага Прэзыдыум і парткалегія ЦКК КП(б)Б

ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

У. М. Ігнатоўскага, як нязкыўшага антыпралетарскага светапогляду і антысавецкіх партый, як сьвядома праводзіўшага на працягу усяго пэрыоду прабываньня ў партыі нацыянал-дэмакратычную ўстаноўку ў сваёй рабоце, зьяўляючагася фактычна кулацкім агентам у партыі, як ашукваўшага партыю пакаяннымі заявамі, прыкрываючы імі працяг сваёй групавой антыкамуністычнай дзейнасьці ў радох КП(б)Б і як чужога элемэнта, адгрываўшага на руку нацдэмаўскай контр-рэвалюцыі,—з радоў КП(б)Б ВЫКЛЮЧЫЦЬ.

Старшыня ЦКК КП(б)Б **КАЛНІН.**
Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б **РЫСЬКІН.**

Па справе Жылуновіча З. Ф.

Жылуновіч З. Ф. (Цішка Гартны), член КП(б)Б з 1918 г., беларус, 43 гады, па сац. паходжаньні—з сялян, асноўная прафэсыя—літаратар (раней, каля 8 год быў рабочым на дробных прадпрыемствах, тым служачым). З 1904 па 1916 год (з перапынкам) прымкаў да меншавіцкай арганізацыі і з 1916 па 1918 г. прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыяналістычным дробна-буржуазным руху (арганізатар і кіраўнік Бел. Сац. Грамады ў Ленінградзе, удзельнік трох зьездаў бел. нацыяналістычнай рады, Беларускай Сацыялістычнай Грамады і вайскоўцаў). За час прабываньня ў партыі займаў рад адказных пастоў у Беларусі (рэдактар газ. «Сав. Бел.», кіраўнік Белдзяржвыдавецтва, Нам. Наркамасьветы і Кіраўнік Галоўмастацтва і інш.).

За права-апартуністычную лінію ў нацыянальна - культурных пытаньнях ня раз прыцягваўся да партыйнай адказнасьці (вымова ў 1928 г. і суровыя вымовы з папярэджаньнем у 1924 і 1929 г. г.

Абвінавачваецца ў тым, што:

1) Уступаючы ў рады Камуністычнай партыі бальшавікоў з дробна-буржуазных і нацыяналістычных арганізацый, ня толькі ня зжыў светапоглядаў і ідэалёгію гэтых антысавецкіх партый, але на першых-жа парах сваёй работы, будучы ў партыі, паказаў сябе як яўкі нацыяналіст (супраціўленьне бальшавіцкім мерапрыемствам пры канструяваньні першага савецкага ўраду Беларусі, патрабаваньне захаваньня ў КП(б)Б самастойнай беларускай сэкцыі і інш.). тым самым актыўна працістаўляў сябе і дэзарганізатарскі дзейнічаў супроць бальшавіцкага кіраўніцтва.

2) Адхілены ад актыўнай ролі ў першым савецкім ураздзе БССР, як падправаўшы давер'е партыі сваімі нацыяналістычнымі дзеяньнямі, Жылуновіч і потым не ажыцьцявіў ад [illegible] стычнага чаду і ва ўсёй сваёй далейшай дзейнасьці, на літаратурным фронце і ў практычнай савецкай рабоце, ня толькі сам праводзіў нацыянал-апартуністычную і нацыянал-дэмакратычную лінію, але служыў шыльдай і зьяўляўся рупарам контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці нацыянал-дэмакратаў, акружыў сябе ў сваёй рабоце, галоўным чынам, нацдэмаўскімі і нац.-апартуністычнымі элемэнтамі. Будучы рэдактарам газэты «Савецкая Беларусь» а потым кіраўніком Белдзяржвыдавецтва, ператварыў іх у органы для выступленьняў. абслугоўваньня і прапаганды кочтр-рэвалюцыйных, нацдэмаўскіх ідэй. У гэтых жа мэтах было выкарыстана літаратурнае аб'яднаньне і часопіс «Полымя». Акрамя таго, ведаючы аб фальсфікацыі гістарычных фактаў Ігнатоўскім і інш. (гісторыя рэвалюцыйнага руху Беларусі, мінмая партызанская дзейнасьць так званай БКС, якою быццамбы кіраваў Ігнатоўскі, скажэньне гісторыі КП(б)Б і інш.). Жылуновіч ня толькі не выкрываў іх, а і сам ва ўгоду беларускаму нацыяналізму фальсфікаваў і скажаў гістарычныя факты (мнімая рэволюцыйная дзейнасьць Бел. Сац. Грамады, рады і г. д.).

3) Будучы адраваным ад пралетарскіх мас, страціўшы пралетарскае чуцьцё ў сваёй рабоце, арыентуючыся на нацдэмаўскую інтэлігенцыю, быццам рашаючую сілу ў правядзеньні і вырашэньні нацыянальнага пытаньня і культурнага будаўніцтва, меў цесную сувязь з ёю і апіраўся на яе ў мэтах супраціўленьня і барацьбы за зьмяненьне партыйнай лініі ў нацпалітыцы. Сумесна з нацдэмамі, стоячы на пазыцыях адраджэнства, арыентуючыся ўвесь час на буржуазны захад ў прапагандзе Саюзу ССР, усхваляючы буржуазную культуру, скочваўся да простай сувязі з нацыянал-фашыстамі (Езавітаў. Луцкевіч), салдэйнічаў контр-рэвалюцыйнай рабоце нацдэмаў і іх спробе ператварыць БССР у буржуазна-кулацкую дзяржаву.

**4) Ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні і прыцягненьні да партадказнасьці аж да выключэньня з партыі (за сумеснае выступленьне з нацдэмаўскімі элемэнтамі ў часе так званай «акадэмічнай канфэрэнцыі», за тэатральную дыскусію і г. д.). Жылуновіч ня толькі не зрабіў спробы выправіць сваю антыкамуністычную лінію, але па сутнасьці працягваў праводзіць варожую партыі работу, двурушнікаў і ашукваў партыю, у тойвачоны ад яе (няшчырасьць у пэрыяд чысткі)

Агонь па апартуністычнай практыцы ў культурным будаўніцтве

Бязьлітасная барацьба з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, якія маюць месца ў рабоце навучальных установаў

Браць за прыклад Слуцкі раён, які дамогся значных станоўчых паказьнікаў у справе культурнага будаўніцтва

У Капыльскім і Лёзьнянскім раёнах, у выніку апартуністычнай недаацэнкі, стварыўся рад прарываў на фронце культурнага будаўніцтва

Раўняцца па перадавых

Узьняць рабочыя і працоўныя масы ў паход за рашучае ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі і ўраду па пытаньні культурнай рэвалюцыі—вось асноўная задача культпаходу, які зараз праводзіцца ў форме культэстафэты.

Ці можна зараз сказаць, што гэтая баявая задача, задача мабілізацыі рабочых і працоўных мас на рашучае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду ў галіне культурнага будаўніцтва выканана?

Трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што гэтая задача ў асноўным выканана. У выніку культпаходу рабочыя і працоўныя масы пад кіраўніцтвам КП(б)Б узьняты ў паход за стварэньне беларускай культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу. Праз культпаход [illegible] рабочых і працоўныя масы на практычнае вырашэньне праблемы культурнай рэвалюцыі, на справе пачала ажыцьцяўляцца баявая задача мабілізацыі пісьменных на барацьбу з няпісьменнасьцю, з некультурнасьцю, з цемраю, што зьяўляецца значнай перашкодай на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Прыклад баявога вырашэньня праблем культурнай рэвалюцыі паказвае Слуцкі раён. Слуцкі раён, у выніку культпаходу атрымаў значныя посьпехі на фронце культурнага будаўніцтва.

Побач з раёнамі, якія дамагліся значных перамог на фронце культурнага будаўніцтва ёсьць і такія, якіх яш э і да гэтага часу не зрабілі амаль нічога па ліквідацыі прарыву на гэтым найадказнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Да такіх раёнаў, якія зрываюць культурнае будаўніцтва можна аднесьці Капыльскі, Лёзьнянскі, і інш. Культпаход у гэтых раёнах ня ўнёс ніякага зруху ў справу культурнага будаўніцтва. Такая недаацэнка культпаходу прывяла да зрыву ліквідацыі няпісьменнасьці ўсеагульнага навучаньня, палітэхнізацыі школы. Сулроць такіх адносін да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду ў галіне культурнай рэвалюцыі трэба весьці самую бязьлітасную барацьбу, як з праявай апартунізму на практыцы.

Асабліва небясьпечна стаіць справа з клясава-інтэрнацыянальным выхаваньнем. Клясава-інтэрнацыянальнае выхаваньне зьяўляецца найбольш слабым вучасткам культпаходу. Друкуемыя сёньня матар'ялы кажуць нам аб тым, што ў гэтай галіне ёсьць буйныя прарывы. Праявы вялікадзяржаўнага шавінізму анты-сэмітызму, беларускага нацыянал-дэмакратызму, маюць месца ня толькі сярод вучнёўскай масы, але і сярод настаўніцкага складу. Барацьба супроць праяў шавінізму ўсіх колераў вядзецца ў недастатковай меры.

Культпаход увайшоў у рашаючую стадыю свайго разгортваньня. Трэба кожнаму раёну дамагчыся поўнай ліквідацыі прарыву на фронце культурнага будаўніцтва. Партарганізацыі павінны забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду, якія даны ў сувязі з правядзеньнем культпаходу, які зьяўляецца магутным сродкам у барацьбе за бальшавіцкія тэмпы, у вырашэньні першачарговых задач культурнай рэвалюцыі. Трэба браць раўненьне на перадавыя раёны.

Я. М.

Колькасныя перамогі ператварыць у якасныя

Слуцкі райштаб культэстафэты вызначыў наступныя маршруты:

1. Поўнае выкананьне пастаноў аб увядзеньні абавязковага ўсеагульнага навучаньня.
2. Увядзеньне палітэхнізацыі ў школах.
3. Поўны ахоп няпісьменных ліквпунктамі і групамі, згодна вызначанага пляну.
4. Палепшаньне культмасавай работы.
5. Правядзеньне шэрагу мерапрыемстваў па інтэрнацыянальным выхаваньні насельніцтва.

Згодна вызначаных пунктаў на правядзеньні культэстафэты праблема наступная:

1) **усе дзеці школьнага ўзросту ахоплены школамі, а перароскі ліквпунктамі і школамі малапісьменных.** Аказана дапамога бяднейшым вучням: выдана 2.400 пар абутку, 300 касьцюмаў, 360 дзіцячых палітo і 200 шапак. **Уведзены гарачыя сьнеданьні ў школах, якімі ахоплена 80 проц. вучняў.** Гарбата бедняцце ў школах выдаецца даўма.

2) **Школы раёну прымацаваны да прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў.** Да калгасаў не прымацаваны толькі такія школы, якія ня маюць блізка калгасаў. Такіх школ налічваецца каля 10, але-ж і яны маюць сувязь з калгасамі шляхам наведваньня іх праз экскурсіі.

3) **Пляны па ліквідацыі няпісьменнасьці выкананы на 90 проц.,** арганізавана 132 ліквпункты, а таксама арганізаваны групы. Усімі ліквпунктамі і групамі ахоплена 5.955 няпісьменных. **Мабілізавана на гэтую справу, апроч настаўнікаў і ліквідатараў, 176 культармейцаў.** Ліквпункты і школы малапісьменных поўнасьцю забясьпечаны падручнікамі і лісьмовымі прыладамі. Не забясьпечаны падручнікамі ліквпункты па яўмове.

4) Адчынена 2 хаты-чытальні і арганізавана 13 чырвоных куткоў, з іх пры калгасах—8.

5) Па інтэрнацыянальна-клясавым выхаваньні праведзены шэраг сходаў з пастаноўкай даклада аб інтэрнацыянальным выхаваньні. Такія сходы праведзены па ўсіх саюзах, у саўгасах і інтэрнацыянальных калгасах. У школах гораду праведзены інтэрнацыянальныя вечары.

Райштаб культэстафэты Слуцкага р.

Трэба абвясьціць 10-дзеньнік штурму

Культэстафэта зусім не заглянула ў Копыльскі раён.

[illegible] ня былі накіраваны на вёскі для мабілізацыі ўвагі працоўных мас вёскі і паладжаньня на месцах работы па культэстафэце. У выніку значная колькасьць калгасьнікаў і сялян ня ведаюць пра эстафэту. Вучот няпісьменных і малапісьменных праводзіўся ня ўсюды. Напрыклад, Лешнянскі сельсавет у гэтым напрамку нічога не зрабіў. Калі настаўніца т. Хартановіч скардзілася старшыні гэтага сельсавету т. Папельскаму, што некаторыя не наведваюць ліквпунктаў, дык ён махнуў рукой і кажа: «мая справа малая—абы я быў пісьменны, а яны як хочуць».

Неабходна бездакладна агульнымі сіламі па баявому ўзяцца за правядзеньне культэстафэты. Неабходна абвесьціць дзесяцідзеньнік штурму для ліквідацыі прарываў на культурным фронце

Ант. Крушынаў.

Культштурм па брагінску...

Культэстафэта зьяўляецца лепшым мэтадам шырокіх працоўных мас у барацьбу за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэвалюцыі. Культэстафэта пры правільным кіраваньні ёю, як тое паказвае жыцьцё, выклікае надзвычайную актыўнасьць рабочых, калгаснікаў і бядняцка-сярэднятніх мас вёскі, якія шляхам сацыялістычнага і ўдарніцтва змагаюцца з прарывамі на фронце культурнага будаўніцтва.

У выніку сацыялістычнага мы наглядаем праяўленьне вялізарнай ініцыятывы працоўных мас у справе лепшага разгортваньня масавай культработы, у справе хутчэйшай ліквідацыі няпісьменнасьці.

Пра ініцыятыву мы і зьбіраемся гаварыць. Не пра тую ініцыятыву, якая дапамагае ліквідаваць прарывы на фронце культурнага будаўніцтва, а пра тую, што зарадзілася, як відаць, у выніку культпаходу у галовах некаторых з адказных працаўнікоў Брагінскага райвыканкому.

Ідэйка гэткая, праўду кажучы, неяк... таго..., нязро і тое...; Вачыце, мімавосі ставіць кропкі...

Для нейкай канцылярыі патрэбна было памяшканьне.

Ламалі брацціны галовы, ламалі; круцілі мазгамі, круцілі ту і дакруцілися да гэтай самай ідэйкі...

Зьяўляюцца два працаўнікі ў райную бібліятэку і імем райвыканкому прапануюць... у **двухгадзінны тэрмін ачысьціць памяшканьне.**

— Таварышы, што вы, гэта-ж зьдзек з культурнай установы, гэта-ж супярэчыць дырэктывам партыі і ўраду, паспрабавалі наступаць працаўнікі бібліятэкі.

Не дапамагло... Прыйшлося ёсьці да старшыні райвыканкому, а той апрача чатырох слоў і гаварыць нічога ня хоча:

— Прапаную зараз-жа ачысьціць памяшканьне...

А ў гэты час, у бібліятэцы разгортваўся ня культпаход, а... паход супроць кніжак, супроць культурнай рэвалюцыі.

Проста кажучы, тыя два пасланцы, узброеныя сякерамі, ударна ламалі палічы. Ляцелі дошкі, трэскі, ляцелі на падлогу кніжкі, газэты, часопісы... Памяшканьне бібліятэкі было ўзята штурмам.

Некаторыя з брагінцаў сьвяткуюць «перамогу», але... ня добрая гэта перамога. Праўду кажучы, ад яе пахне галавацяпствам буйнага маштабу. Акрамя таго, гэта «перамога» гаворыць аб тым, што ў нас, па месцах, часам ігнаруюцца важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду.

А гэта, таварышы, з Брагіна, ёсьць ня што іншае, як апартуністычная практыка ў галіне культурнага будаўніцтва.

В. Зайцаў.

Справа ня рушыцца з мейсца

Старт культэстафэты па Лёзьнянскім раёне быў дадзены толькі ў першых днёх сьнежня. Спачатку за работу ўзяліся горача, былі складзены пляны, праводзіліся сходы, завербавалі шмат культармейцаў. У выніку, па першым маршруце «за ўсеагульнае навучаньне» маюцца некаторыя дасягненьні. Праведзены вучот як дзяцей, таксама і дарослых няпісьменных. Наладжана ліквідацыя няпісьменнасьці.

Забытым-жа вучасткам засталося пытаньне палітэхнізацыі школы. У цэнтры раёну маецца дзьве школы, ёсьць калгас, ільназавод, ёсьць у наяўнасьці ўсе магчымасьці да ажыцьцяўленьня палітэхнізацыі.

Між-тым, да гэтага часу ў гэтым напрамку нічога ня зроблена. Праект дагавораў паміж яўрэйскай ШКМ і калгасам «Камінтэрн» пачалі абгаварваць яшчэ месяц назад, а потым запаматалі скончыць абгаварэньне праекту. У гэтым калгасе маецца каля 10 няпісьменных калгаснікаў, якія вельмі жадаюць вучыцца. Культармейцы паабяцалі ліквідаваць іх няпісьменнасьць, а калгаснікі і дагэтуль застаюцца па-за ліквпунктам, бо яго няма.

На заклік культармейцаў арганізаваць у калгасе пэлы рад гурткоў, калгаснікі вельмі жыва адгукнуліся, зараз-жа запісалася ў гурткі каля 70 чал., а справа зноў ня рушыцца з месца. Амаль месяц ходзяць калгаснікі даведацца, калі пачнуць працаваць гурткі, адказаць-жа ім на гэта няма каму, бо тыя, хто зваў у гурткі, зусім не паказваюцца ў калгас.

Неабходна ўскалыхнуць культармейцаў з ШКМ, час ужо ўзяцца за работу, за ажыцьцяўленьне сваіх абяцаньняў.

К-в.

Трэба перагледзець справу

БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ ПА ПРЫМІРЭНЧЫХ АДНОСІНАХ ДА ПРАЯЎ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНАГА ШАВІНІЗМУ

На Рабфаку пры Сельска-Гаспадарчай Акадэміі мела месца вылазка вялікадзяржаўнага шавінізму з боку сакратара парт'ячэйкі рабфаку тав. Краўцова, які таварыў, што ён не застанецца ў Акадэміі па той прычыне, што ня ведае беларускай мовы.

На партыйным сходзе шмат таварышоў выказалася аб тым, што бюро рабфакаўскай парт'ячэйкі ня здолела на бальшавіцку ліквідаваць тыя прарывы, якія меліся на рабфаку, што бюро партыйнай ячэйкі не рабіла палітычнай ацэнкі і адпаведных аргываў даў, што бюро парткалектыву Акадэміі таксама не зварочвала ўвагі на барацьбу з антысэмітызмам.

Пасьля спрэчак партыйны сход ухваліў бюро парт'ячэйкі рабфаку распусьціць.

Трэба адзначыць, што з боку парткалектыву Акадэміі на тыя праявы вялікадзяржаўнага шавінізму, якія меліся ў ячэйцы рабфаку ня было сапраўднага бальшавіцкага рэагаваньня. Напрыклад, пасьля сходу рабфаку адбылося пасяджэньне парткалектыву Акадэміі, дзе разглядалася пытаньне аб роспуску бюро парт'ячэйкі рабфаку. Бюро парткалектыву на аснове матар'ялаў сходу рабфаку і ўражаньняў сакратара парткалектыву тав. Эгільта (тав. Эгільт прысутнічаў на закрытым партсходзе рабфаку) выносіць пастанову наступнага зьместу: «Ужытыя мерапрыемствы і датэрміновыя перавыбары зацьвердзіць. Прыняць да ведама, што бюро парт'ячэйкі рабфаку пераабрана за праявы вялікадзяржаўнага шавінізму. Прапанаваць партчастцы дырэкцыі акадэміі вылучыць т. Трашчанка на навукову працу. Лічыць мэтазгодным тав. Трашчанка надалей скарыстаць загадчыкам рабфаку, узгадняўшы гэтае пытаньне з Райкомам КП(б)Б. т. Хвасьцюка адпусьціць з арганізацыі».

Бюро парткалектыву Акадэміі абмежавалася толькі фармальным штампаваньнем самага факту праявы вялікадзяржаўнага шавінізму на рабфаку і не зрабіла з гэтага належных палітычных вываду. Такія паводзіны бюро парткалектыву нельга інакш кваліфікаваць, як прымірэнцтва да вялікадзяржаўнага шавінізму.

Горацкаму РК КП(б)Б неабходна гэтую справу разглядзець і зрабіць адпаведныя вывады аб здольнасьці бюро парткалектыву Акадэміі быць кіраўніком усяго акадэмічнага калектыву.

Хвасьцюк.

З карэньнямі вырваць нацдэмакратызм з практыкі работы школ

Шкодніцкая дзейнасьць беларускіх нац-дэмакратаў знаходзіць свой адбітак на рабоце выгушчаных імі кадраў. Палова настаўнікаў Капцевіцкай ФЗС зьяўляюцца непасрэдна працуючымі нац-дэмакратычнага ўзьдзейнічаньня на кадры. Прыведзем некалькі фактаў. У момант шырокага разгортваньня калгаснага будаўніцтва вучням дыктуюцца клясава-навытрыманыя з прынцыпаўскім напрамкам прапановы, як напрыклад,—«Успомніць бабулька мінулыя дні ды заплача». Вучні дайшоўшы да 7 гр. ня могуць ні па-расійску, ні па-беларуску пісьменна і стылістычна правільна выказаць сваю думку.

У бібліятэцы школы і на руках вучняў знаходзяцца нац-дэмаўскія кніжкі—«Праваліс» Лёсіка, «Родныя Шляхі», «Беларусь» Смолічча, якія згодна загаду Наркамасьветы Беларусі даўно павінны быць выняты з ужываньня. Пры чым цікава адзначыць, што некаторыя настаўнікі не адзін раз напаміналі адміністрацыі школы аб неабходнасьці вынять з ужываньня нацдэмаўскія падручнікі. Але адміністрацыя школы застаецца глухой і нічога не робіць. У Капцевіцкай ФЗС знаходзяцца такія настаўнікі, як Пятровіч, які адкрыта ў настаўніцкім пакоі заяўляе аб сваім спачуваньні «пазіцыйным» ахвярам—беларускім нацдэмам. Характарным зьяўляецца таксама маўчаньне Капцевіцкага сель-савету, які да гэтага часу ня выступіў з пратэстам супроць контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці групы нац-дэмаў. Трэба з карэньнямі вырваць нацыянал-дэмакратызм з сыстэмы ўсёй выхаваўчай работы нашых навучальных установаў.

Петрынавец.

Беларускую Акадэмію Навук ператварыць у фарпост сацыялістычнага будаўніцтва

Тав. П. О. Горын абраны прэзыдэнтам БАН

(У акадэмічным савеце БАН).

Учора пад старшынствам тав. Шчарбакова адбылося пасяджэньне акадэмічнага савету Беларускай Акадэміі Навук.

Тав. Шчарбакоў, адчыняючы пасяджэньне акадэмічнага савету, коратка спыніўся на тых задачах, якія стаяць перад Беларускай Акадэміяй Навук у сучасны пэрыяд—пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, у пэрыяд, калі ідзе па ўсім фронце сацыялістычнае наступленьне на рэшткі капіталістычных элемэнтаў.

— Мы ўсе ведаем спадчыну, якую ў БАН пакінулі контррэвалюцыянэры—беларускія нацдэмы. Нам прыдзецца весьці вялікую работу па ліквідацыі спадчыны, якую пакінулі ў БАН нацдэмы. Акадэмічнаму савету і БАН прыдзецца ня толькі доўгі час працаваць над ліквідацыяй гэтай спадчыны, але і правесьці вялікую напружаную работу па ператварэньні БАН у сапраўдную пралетарскую Акадэмію Навук. Усю работу БАН трэба падначаліць задачам сацыялістычнага будаўніцтва,—закончыў сваю прамову т. Шчарбакоў.

Пасьля зацьверджаньня парадку дня акадэмічны савет БАН прыступае да работы. Першым пытаньнем стаіць —выбары Прэзыдэнта БАН.

Аднагалосна абіраецца правадзейным акадэмікам БАН, а потым і Прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук тав. П. О. Горын (Каляда).

Па пытаньні аб дадатковых выбарах акадэмікаў БАН, акадэмічны савет пастанавіў разгарнуць шырокую растлумачальную работу, уцягнуўшы ў справу даабраньня акадэмікаў шырокія рабочыя масы і ўсю савецкую грамадзкасьць.

Для правядзеньня гэтай работы абрана камісія ў складзе 8 чал. У камісію абраны т. т. Хацкевіч, Платуш, акадэмік Вальфсон, Шчарбакоў і інш.

Кампанія па даабраньні акадэмікаў будзе наданы шырокі грамадзкі характар. Працягнецца яна да 20 лютага г. г.

Апошнім пытаньнем акадэмічны савет разгледзеў і зацьвердзіў пляны работы БАН на 1931 год.

П. О. Горын (Каляда)

(Кароткі жыцьцёпіс)

Тав. Горын (Каляда) нарадзіўся ў 1900 г. у Зах. Беларусі. Бацькі—сяляне. Самастойна жыве з 15 год. У Кампартыю ўступіў у 1918 г. і з гэтага часу, галоўным чынам, працаваў у галіне партыйнай, навуковай і грамадзкай работы. У пачатку 1919 г. быў членам Валаснога Рэўкома ў Зах. Беларусі і арганізатарам Валаснай Камуністычнай партыйнай ячэйкі. Пасьля разгрому арганізацыі бела-палякамі і пабегу з Зах. Беларусі, у лютым 1919 г., пашоў добраахвотнікам у дзейную Чырвоную армію, дзе працаваў у якасьці палітпрацаўніка да канца 1919 г. У студзені 1920 г. быў камандыраваны ва Ўніверсытэт імя Сьвярдлова на 6-месячны курс, па сканчэньні якога быў пакінуты ў лектарскай групе. За час бытнасьці ва Ўніверсытэце, па партмабілізацыі неаднакроць выконваў рад партыйных і савецкіх даручэньняў (у 1920 годзе быў членам і пазьней сакратаром павятовага партыйнага камітэту, упаўнаважаным Галоўкампрацы па Вароненскай губ. і г. д.). З 1921 г., па сканчэньні лектарскага курсу Кам. Ўніверсытэту імя Сьвярдлова, быў пакінуты ў якасьці навуковага супрацоўніка Ўніверсытэту, а з 1923 г.—у якасьці выкладчыка Ўніверсытэту імя Сьвярдлова. Адначасова ў 1923-1925 г. вучыўся ў Інстытуце чырвонай прафэсуры, на гістарычным аддзяленьні, якое і скончыў у 1925 г. З 1925 г. і да сучаснага моманту быў членам прэзыдыума т-ва гісторыкаў-марксыстых і працаваў з часу яго заснаваньня навуковым сакратаром гэтага-ж т-ва. У 1926-28 г. быў адным з старшынь т-ва палит-эмігрантаў Зах. Беларусі. У 1925-1926 г.—старшыня Катэдры гісторыі ў Палит-асьветным Інстытуце. У 1927 г. выбраны членам Інстытуту Савецкага Будаўніцтва. У 1930 г. выбраны ў правадзейныя члены Кам. Акадэміі і кандыдатам у члены Прэзыдыума Кам. Акадэміі.

У сучасны момант т. Горын (Каляда) працуе ў якасьці нам. дырэктара Інстытуту Гісторыі Кам. Акадэміі, членам прэзыдыуму Таварыства Гісторыкаў-Марксыстых, членам Дзярж. вучонага савету, членам Рэдкалегіі і нам. адказнага рэдактара часопісу «Пролетарская Революция» (з канца 1926 г.); членам Рэдколегіі часопісу «Историк-Марксист» (з моманту заснаваньня) і членам рэдкалегіі «История Пролетариата СССР». Педагагічную работу т. Горын (Каляда) вядзе ў 2-м Маскоўскім Дзяржаўным Унівэрсытэце і ў Інстытуце Чырвонай Прафэсуры. Навуковa-дасьледчую работу вядзе над вывучэньнем гісторыі Саветаў Р. Д. у 1917 г., першы том гэтай працы закончыў у гэтым годзе.

Тав. Горын (Каляда) мае шэраг навуковых друкаваных прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху.

З чым мы падыходзім да фінішу

Капцэвіцкі завод «Зорка» (Петрыкаўскі раён) разам з іншымі арганізацыямі ў дзень XIII гадзіны Кастрычніка ўключыўся ў культэстафэту.

За ўвесь час ходу культэстафэты толькі адзін раз зьбіраўся штаб і канстатаваў, што кіраўнікі асобных атрадаў не спраўляюцца з сваёй работай. Кіраўнікоў зьмянілі, зьменшылі і колькасьць маршрутаў.

Трэба проста сказаць, што культэстафэта па Капцэвіцкім сельсавеце сарвана.

А. Д.

О. Канакоцін

Абвастрэньне клясавай барацьбы ў беларускай літаратуры ў пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі*)

Клясавая барацьба ў беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыцы складае непадзельную частку тых пра цасаў абвастрэньня клясавай барацьбы, якія мы наглядаем на Беларусі і ва ўсім Савецкім Саюзе ў выніку нашага рашучага наступу па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва і па ўсім фронце барацьбы за стварэньне культуры сацыялістычнай па зьместу і нацыянальнай па форме.

Мы маем факты, калі клясавы вораг займаўся шкодніцтвам на чыгунцы, пад нізвай саўгасы і калгасы, прасякаў у культурныя органы і там праводзіў шкодніцкую работу; клясавы вораг выступаў у выглядзе антысэмітызму, зьдзекваючыся над работніцай Баршай на гуце «Кастрычнік» у б. Бабруйскай акрузе, або выпальваючы вочы вапнаю адному з прыкладных рабочых будаўнікоў Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату тав. Нэйману. Ён (клясавы вораг) зьбіваў беларускую жанчыну, якая пажанілася з яўрэям, выступаючы у данным выпадку ў выглядзе клясава-варожага яўрэйскага шавінізму. На паасобных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва ён шкодзіў нам у выглядзе вялікадзяржаўнага шавінізму, выступаючы супроць беларусізацыі, узводзячы паклёп на партыю абвінавачваньнямі ў прымусовым праведзеньні беларусізацыі і імкнуючыся давесьці, што няма беларускай мовы, а ёсьць «наречие» у расійскай мове. Клясавы вораг у выглядзе беларускага нацыянал-дэмакратызму, зьвязанага цеснымі сувязямі з нацыянал-фашызмам Заходняй Беларусі, праўдзе у такія ўстановы, як Наркамасьветы, Наркамзем, БАН, якая ў большай частцы сваіх катэдр знаходзілася ў палоне ў контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, які карыстаўся інстытутамі і ўстановамі, аб'яднанымі Беларускай Акадэміі Навук, для популярызацыі шкодных нацыяналістычных тэорый, карыстаўся Акадэміяй, як месцам для сваіх контррэвалюцыйных вылазак. Клясавы ворат праляе і ў Дасьледчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. Ён распасьцёр свае шчупальцы і на мастацкую літаратуру, дзе працэсы клясавай барацьбы, працэсы абвастрэньня гэтай барацьбы, былі даволі ярка выражаны.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм, зніраючыся на кулацтва і дробную буржуазію, праявіў вялікую актыўнасьць у сваёй шкодніцкай рабоце і на фронце культурнага будаўніцтва і, у прыватнасьці, літаратуры.

Партыя мабілізавала ўвагу мас на барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам. Пралетарская грамадзкасьць пад кіраўніцтвам партыі пашла ў штыхі на контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм. Орган пралетарскай дыктатуры—ДПУ выкрыў контррэвалюцыйную групу беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Пленум ЦК КП(б)Б, які адбываўся ў кастрычніку месяцы, даў наступную характарыстыку беларускаму нацыянал-дэмакратызму:

Беларускі нацыянал-дэмакратызм,—гаворыцца ў рэзалюцыі па нацыянальным пытаньні,—«характарызуецца барацьбою за капіталістычную рэстаўрацыю і арыентоўкай на захад, у прыватнасьці на фашыцкую Польшчу у процілегласьць пралетарскай Маскве. Нацыянал-дэмакратызм прапаведуе тэорыю самабытнасьці, тэорыю, якая ўзводзіць у догму вузкую правінцыяльную абмежаванасьць.

Тэорыя самабытнасьці вяла да ідэалізацыі фэўдальнага і буржуазнага мінулага і знайшла сваё адлюстраванне, у прыватнасьці, у шуканьнях роск віту беларускай культуры ў эпоху сярэднявякоўя, у ідэалізацыі шляхецкіх рэвалюцыянэраў, накшталт Кастуся Каліноўскага і г. д.

Нацыянал-дэмакратызм непружвае ўсе свае сілы да таго, каб накіраваць культурнае будаўніцтва БССР па шляху стварэньня культуры буржуазнай па сваім зьместе і нацыянальнай па сваёй форме.

Падобна вялікадзяржаўнаму шавінізму, беларускі нацыянал-дэмакратызм стаіць на глебе прызнаньня няўхільнасьці барацьбы двух культур—расійскай і беларускай. Выходзячы з гэтай тэорыі, беларускі нацыянал-дэмакратызм стварае агульны фронт з беларускім нацыянал-фашызмам па той бок мяжы (Луцкевіч, Астроўскі, Станкевіч і інш.). Ён зьяўляецца, такім чынам, агентурай беларускага нацыянал-фашызму—сустаўной часткай польскага фашызму».

Усе гэтыя характарныя рысы беларускага нацыянал-дэмакратызму знайшлі сваё адлюстраваньне і ў беларускай мастацкай літаратуры. На літаратурным фронце контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм выступаў праз сваіх агентаў, якіх ён завербаваў з меней устойлівых у клясавых адносінах прадстаўнікоў беларускай культуры, ці проста праз пасылку сваіх агентаў у шэраг беларускіх літаратурных аб'яднаньняў. Нам ужо вядомы такія факты, калі «свае людзі» пасылаліся беларускімі нацыянал-дэмакратамі ў шэраг устаноў, у шэраг галін нашага культурнага і гаспадарчага будаўніцтва, з мэтай там шкодзіць, з мэтай быць сапраўднымі агентамі гэтай контррэвалюцыйнай групы. Беларускі нацыянал-дэмакратызм і на літаратурным фронце пасьпеў за гэтыя гады ня мала прынесьці нам шкоды. Ад скрытых замаскаваных вылазак ён пераходзіць у адкрыты наступ, у адкрытыя контррэвалюцыйныя вылазкі супроць пралетарскай дыктатуры.

Трэба сказаць, што мы мелі ня толькі паасобныя выступленьні паасобных прадстаўнікоў, якія ўваходзілі ў тое ці іншае аб'яднаньне беларускіх літаратараў, але ў нас былі і такія зьявы, калі ня пэўныя арганізацыі, у пэўныя моманты абвастрэньня клясавай барацьбы, выступалі з ідэямі нацыянал-дэмакратызму, выступалі супроць нас. Праўда, выступалі не з дэклярацыямі ўсяго аб'яднаньня, а адзін за другім з вызначанай лініяй супроць нас.

Абвастрэньне клясавай барацьбы на літаратурным фронце выклікае тую клясавую дыфэрэнцыацыю, якая адбываецца спачатку ў выглядзе адыходу ад «Маладняка» дзьвёх груп пісьменьнікаў, а потым і ў выглядзе арганізацыйнага афармленьня клясава дыфэрэнцыяваных груп пісьменьнікаў.

Арганізацыйнае афармленьне клясавай дыфэрэнцыяцыі ў беларускай літаратуры

Клясавая дыфэрэнцыяцыя, якая адбывалася ў беларускай літаратуры, ня дома нам ня толькі адыходам дзьвёх груп ад «Маладняка», якія потым увашлі ва ўноў арганізаваныя літаратурныя аб'яднаньні «Полымя» і «Узвышша», але і тым, што да гэтых новых аб'яднаньняў прыходзяць людзі, якія стаяць у баку ад сацыялістычнага будаўніцтва, людзі з яўна зьмешанымі хаўскімі установамі, прымушаныя пасьля доўгага маўчаньня прызнаць, што савецкая ўлада цьвёрдая. Гэтыя маўчальнікі з двух і трох гадовым стажам літаратурнага маўчаньня ўваходзяць далёка не з пралетарскімі ідэямі ў беларускую літаратуру.

Мы маем апрача спамянёных трох аб'яднаньняў, яшчэ два—«Проблёск» і «Літаратурна-мастацкую камуну», якія зьяўляцца таксама ў выніку клясавай дыфэрэнцыяцыі. Бо і тыя афіцыяльныя заявы гэтых груп аб разыходжаньні ў творчых мэтодах мелі без сумненьня сваю клясавую сутнасьць. «Проблёск», не пасьпешны замацавацца, распаўся і пашоў зноў за «Маладняком», «Літаратурна-мастацкая камуна», прайснаваўшы некалькі месяцаў, распадаецца.

Такія-ж працэсы клясавай дыфэрэнцыяцыі адбываліся і сярод літаратурных груп нацыянальных меншасьцяй. Група яўрэйскіх пісьменьнікаў «Юнгер Арбэйтар» мела адыход людзей з упад ніцкімі настоямі і людзей, якія ўпалі ў мыстыцызм. У расійскай групе «Зьвенья» дыфэрэнцыяцыя ішла па шляху арганізацыйнага адколу новай групы «Перавал».

Некаторыя публіцыстыя таго часу імкнуліся змазаць клясавую сутнасьць дыфэрэнцыяцыі, якая адбывалася ў беларускай літаратуры прыцяпляючы за валасы такія довады, што адколы груп адбываюцца «па прынцыпу літаратурнага стажу», па формальных прыёмах творчасьці, нажаль гэтыя тлумачэньні тагды ня былі разьбіты да канца і гулялі дзе-ні-дзе да 28-29 г. І калі прыхільнікам змазваньнем клясавай сутнасьці меўшай месца дыфэрэнцыяцыі не ўдавалася выступіць у друку БССР, тагды яны ўводзілі і блытаніну праз расійскія часопісы—прыклад артыкул Ф. Кунцэвіча ў № 11 за 1929 г. часопісу «Печать и революция».

Перш чым гаварыць пра афармленьне і характарыстыку паасобных арганізацый, мы лічым неабходным зрабіць такую заўвагу, што арганізацыйнае замацаваньне клясавай дыфэрэнцыяцыі ішло, галоўным чынам, па дзьвёх лініях: па лініі наближэньня да пралетарскай літаратуры, потым барацьбы за стварэньне беларускай пралетарскай літаратуры — «Маладняк» (які пасьля ўвашоў у ВОАПП і рэарганізаваўся ў БЕЛАПП), і па лініі самабытніцтва і «бясклясавага ўзвышэньства» — беларускай літаратуры—«Полымя» і «Узвышша».

Літаратурнае аб'яднаньне «Полымя», ня гледзячы на вялікую розьніцу ў творчасьці, увайшоўшы ў гэта аб'яднаньне асоб, знайшло адзіную ідэю, якая зьвязвае ўсіх членаў. «Полымя» склалася з часткі старых пісьменьнікаў пэрыоду «Нашай Нівы», і з тае групы пісьменьнікаў, якая пасьля адколу ад «Маладняка» у выніку клясавай дыфэрэнцыяцыі, прымыкае да гэтай групы.

Такім чынам, мы бачым, як-бы два ярка выражаныя крылы «Полымя». Тут навольна ўзьнікае пытаньне, што-ж аб'ядняла гэтых розных людзей—з аднаго боку, групу выхаваную ў пэрыод «Маладняка», у пэрыод разьвіцьця рэвалюцыйнай беларускай літаратуры, а з другога боку, групу, праслаўленую у пэрыяд, калі «Наша Ніва» была амаль не на службе кадэтаў, праслаўленую ў дні польска-нямецкай акупацыі служэньнем Кайзеру, а пасьля Пілсудскаму. Што-ж аб'ядняла гэтыя дзьве групы ў адну арганізацыю «Полымя»? Гэтыя дзьве групы аб'яднала ідэя так званай самабытнасьці беларускай літаратуры. Тыя таварышы, якія вышлі з «Маладняка», падзялялі моманты клясовыя момантамі нацыянальнымі. Нацыянальныя моманты трымалі іх моцна ў сваіх руках. Група «Полымя» зьяўлялася ні чым іншым, як папутніцкай групай і да гэтай групы павінны былі быць вядомыя адносіны, як да групы папутніцтва. Калі партыя ў сваіх дакумантах, у сваіх пастановах такім чынам гэтую групу і расцэньвала, то паасобныя прадстаўнікі нават з кіраўнічых таварышоў, як мы ўбачым (ніжэй мы пра гэта будзем гаварыць), ад носіліся да «Полымя» далёка ня так, як да папутніцкай групы. І сёньня можна яшчэ чуць разваг, што «Полымя» склалася не пад уплывам адзінай ідэі самабытнасьці, якая ядная гэтыя дзьве групы, не пад уплывам ідэі нацыяналістычнай, а што яно склалася па другіх адзнаках. Вось адно з такіх найбольш небясьпечных адзначэньняў падкрэсьліваю маючых месцца на сёньняшні дзень: **«Полымя» па свай му складу можна назваць канглёмэратам розных плыняў.** Нельга яму даць якую-небудзь аднаабразную палітычную характарыстыку, бо гэта арганізацыя арганізавалася па адзнаці «старых», а не па адзнаці палітычнай і на ват мастацкай. Як бачыце, у гэтым адзначэньні на першым месцы стаіць «канглёмэрат» ідэй, а на другім месцы «адзнака» «старых». І на той і на другой адзнаці наўрад ці можна аб'яднаць арганізацыю, якая далёка не па старыкоўскі дзейнічала на вядомых этапах клясавай барацьбы ў літаратуры. Мы сьцьвярджаем, што не навіта ідэі нацыяналістычнай самабытнасьці былі зьявіном, якое зьвязвала і аб'яднала «Полымя», а ніяк ня прынцып старыкоўства.

І толькі пасьля таго, як гэтая ідэя нацыяналістычнасьці, самабытнасьці прыняла частку «Полымя» да адкрытых вылазак нацыянал-дэмакратызму, другая частка пачынае перацэньваць шляхі, па якіх ідзе аб'яднаньне.

Другая літаратурная арганізацыя, «Узвышша», якая таксама стварылася ў выніку клясавай дыфэрэнцыяцыі беларускай літаратуры аб'ядналася па прынцыпу ўзвышэньня над рачаіснасьцю, па прынцыпу стварэньня беларускага «залатога веку будучыні», а на самай справе карэньні гэтых прынцыпаў жывіліся сокамі кулацкай зямлі, карэньні гэтых высокіх прынцыпаў—залатога веку будучыні Беларусі—заходзілі ў «залаты век мін

СТАЛОУКІ МЦРК

ЯШЧЭ НЕ ПАВЯРНУЛІСЯ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Рашэньне сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК аб тым, каб работу спажывецкай каапэрацыі ўзяць пад асаблівы нагляд, некаторымі партыйнымі арганізацыямі ня выконваецца

„Рашучыя посьпехі ў галіне гаспадарчага будаўніцтва СССР, культурны рост мас і ўцягваньне членаў рабочай сям'і ў вытворчасьць у сувязі з поўнай ліквідацыяй беспрацоўя ставяць перад спажывецкай каапэрацыяй задачу паступовага пераключэньня харчовага забесьпячэньня з форм індывідуальнага спажываньня на грамадзкае харчаваньне, як на першую ўмову „пераходу ад дробнай адзіночна-хатняй гаспадаркі да буйнага аграмаджанага" (ЛЕНІН).

(З рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК)

Палепшыць работу грамадзкага харчаваньня

У ліку работ за выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі пытаньні грамадзкага харчаваньня зай маюць вялікае і адказьнейшае месца. Шырокае разгортваньне грамадзкага харчаваньня і падвышэньне якасьці работы па гэтай галіне, зьяўляецца адной складаной часткай барацьбы за далейшае палепшаньне матар'яльнага дабрабыту рабочай клясы і ўцягненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва шляхам грамадзкага харчаваньня сотні тысяч працоўных жанчын, якія зараз яшчэ прыкаваны да хатняй кухні.

За апошні год у галіне грамадзкага харчаваньня ў БССР, мы дабіліся значных посьпехаў як у сэнсе росту прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, так і палепшаньні якасьці іх работы. Калі ў 1929 г. па ўсёй БССР мелася 64 сталоўкі з дзённым водпускам у іх 27.825 абедаў, дык на 1 сьнежня 1930 г. мы маем 204 сталоўкі з дзённым водпускам 190.000 абедаў. Але поруч з гэтым мы маем шмат і недахопаў у справе грамадзкага харчаваньня. ЦК КП(б)Б па дакладу Белкаапсаюзу ў сваёй пастанове зусім правільна адзначыў, што ня ўсе яшчэ добра зразумелі важнасьць грамадзкага харчаваньня, што становішча грамадзкага харчаваньня ў БССР да гэтага часу застаецца яшчэ вельмі нездавальняючым, як па колькасьці сетак сталовак, таксама і па якасьці іх работы. У шмат сталоўках, якія маюцца на прадпрыемствах, рабочыя стаяць на гадзіне і больш у чарзе за абедамі, а некаторыя рабочыя зусім застаюцца без абеду, што выклікае прагулы і спазьненьні на работу. Да гэтага часу не скарыстоўваюцца сродкі адпушчаныя на пашырэньне грамадзкага харчаваньня (Бабруйск Дрэваапрацоўчы камбінат, Ворша ў чыгуначнікаў) ёсьць шмат сталовак на прадпрыемствах, дзе рабочыя не атрымліваюць гарачых сьнеданьняў і г. д. (Гомель). Ня ўсе яшчэ зразумелі, што грамадзкае харчаваньне зьяўляецца адной з умоў пераходу ад дробнай індывідуальнай гаспадаркі да буйнай аграмаджанай. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі ставіць перад каапэрацыяй задачу „карэннай зьмены работы па разгортваньні грамадзкага харчаваньня ў саўгасах і калгасах. Трэба адзначыць і тое, што тая работа, якая праводзілася каапэрацыяй да гэтага часу, у данай галіне, зьяўляецца зусім нездавальняючай. Грамадзкае харчаваньне павінна быць упарадкавана ў самы кароткі тэрмін. У мэтах палепшаньня грамадзкага харчаваньня каапэрацыйныя арганізацыі павінны зараз-жа рашуча ўзяцца за разгортваньне і арганізацыю найбольшай сеткі сталовак грамадзкага харчаваньня на прадпрыемствах, асаблівую ўвагу зьвярнуць на далейшае разгортваньне сеткі закрытых сталовак, з тым, каб праз гэтыя сталоўкі цалкам ахапіць усіх рабочых, асабліва начных зьмен, якія зараз яшчэ недастаткова ахоплены.

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) у сваім рашэньні аб народна-гаспадарчым пляне ва ўсю шырыню паставіў праблему грамадзкага харчаваньня, для ажыцьцяўленьня лёзунгу «сталоўка—цэх харчаваньня на заводзе». На аснове гэтага рашэньня неабходна рашуча палепшыць грамадзкае харчаваньне і якасьць яго работы.

Для пашырэньня і палепшаньня грамадзкага харчаваньня, неабходна зараз-на ўзяцца за вырашэньне адной з важнейшых задач, якая стаіць перад спажывецкай каапэрацыяй—гэта пашырэньне прыгарадных гаспадарак, якія павінны быць засеяны выключна гародніны культурамі.

Трэба ўстаналіць цьвёрды рабочы кантроль у рабоце грамадзкага харчаваньня, трэба неадкладна на кожным прадпрыемстве пасобку склікаць канфэрэнцыі сталаўнікоў па пытаньні грамадзкага харчаваньня. Трэба дабіцца максымальнай дапамогі ў рабоце каапэрацыі з боку партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый, трэба, каб дырэктыва пленуму ЦК і ЦКК аб тым, каб мясцовыя партыйныя арганізацыі ўзялі работу спажывецкай каапэрацыі пад свой непасрэдны кантроль была-б праведзена ў жыцьцё поўнасьцю.

Не адцягваць подрыхтоўкі

(Ад нашага Бабруйскага карэспандэнта).

Дырэктывы партыі аб разьвіцьці гародніцтва і вялікае значэньне гародніны ў харчаваньні ня ўсюды ўлічаны. Так, у Гомлі, напрыклад, у мінулым годзе грамадзкім харчаваньнем было ахоплена 13.000 чал., а сёлета ёсьць некаторыя дасягненьні ў адносінах набліжэньня грамадзкага харчаваньня да вытворчасьці. Ва ўсіх гарадох БССР арганізуюцца сталовыя на больш буйных прадпрыемствах. На радзе прадпрыемстваў арганізаваны буфэты з халодными закускамі. Арганізавана развозка на прадпрыемствы гарачага сьнеданьня. І тым ня менш нельга сказаць, што грамадзкае харчаваньне набліжана да вытворчасьці.

Так, у Гомлі маецца ўсяго сталовак—20, а на 23-х прадпрыемствах маецца незначная колькасьць сталовак. Буфэтаў у Гомлі маецца 62, а на 23-х прадпрыемствах маецца ўсяго 9 буфэтаў. Гарачае сьнеданьне атрымліваюць толькі 10 прадпрыемстваў і тое пераважна першая зьмена.

Яшчэ менш можна гаварыць аб арганізацыі масавага рабочага кантролю над справай грамадзкага харчаваньня. Аб гэтым сьведчыць рад агідных фактаў, што маюць месца ў сталоўках. Так, у рабочай сталоўцы на дрэваапрацоўчым камбінаце ў Бабруйску рабочыя стаяць у чарзе за абедамі па гадзіне і больш, а некаторыя зусім застаюцца без абеду. Гэта выклікае прагулы і спазьненьні на работу. Між тым на гэтым-жа камбінаце да гэтага часу яшчэ не скарысталі сродкаў, адпушчаных ВСНГ на пашырэньне грамадзкага харчаваньня. Гэткае-ж становішча маецца і ў Воршы ў чыгуначнікаў.

У Гомлі мела месца некалькі выпадкаў, якія гавораць аб значнымі адносінах пасобных работнікаў да абслугоўваньня рабочых. У адной сталоўцы тут у абедзе, была знойдзена мыш. У другой сталоўцы была знойдзена не ачышчаная кішка. У трацьцей, ужо ў часе сапраўднай праверкі, на адно прадпрыемства было прывезена сьнеданьне з газай, і ня глядзячы на тое, што рабочыя ня прынялі сьнеданьня, тое-ж было прывезена і для другой зьмены.

Заяў, скарг і прапаноў з боку рабочых маецца значная колькасьць, але разгаваньне на гэтыя заявы і прапановы паставлена з рук вон дрэнна. Напрыклад, на Бабруйскім камбінаце рабочымі ўнесена рад канкрэтных прапаноў аб палепшаньні работы сталоўкі, у прыватнасьці, аб арганізацыі стандартных абедаў, але гэтыя прапановы не разглядваны.

Дырэктыва партыі аб арганізацыі гарадамі сваёй дапаможнай прадуктовай базы—у выглядзе фермаў, прыгародных і гародных гаспадарак, у рабоце гарсаветаў ня была праведзена ў жыцьцё.

Гомельскі гарсавет займаўся гэтым пытаньнем больш сур'ёзна, але ня здолеў забясьпечыць дастатковага і своечасовага кантролю над гэтай работай.

Бабруйскі гарсавет да апошняга часу не зьвярнуў увагі на тое, што будаўніцтва на ферме зрываецца і зараз там стварылася становішча, што 300 кароў застаюцца пад адкрытым небам. Мала аддадзена ўвагі фэрме і Артанскім гарсаветам.

Можна зараз канстатаваць, што прыгародныя гаспадаркі маюць добрыя пэрспэктывы на разьвіцьцё і ўжо на будучы год пры ўмове дастатковай увагі да іх з боку рабочай грамадзкасьці, змогуць быць буйным фактарам у справе палепшаньня рабочага забясьпечаньня.

Гомельская прыгародная гаспадарка мае ўжо больш як 1.000 кароў, 790 сьвіней і павінна ўзараць каля 2.300 га зямлі. Бабруйская ферма мае 500 кароў і 2.300 га зямлі, Артанская прыгародная гаспадарка мае ўжо адведзенымі 1.000 га зямлі, мае 160 кароў.

Дырэктывы аб арганізацыі масавага рабочага кантролю над работай каапэрацыі і набліжэньні гэтага кантролю да нізавой каапэрацыйнай адзінкі ў гарсаветах не прапрацаваны і не праведзены ў жыцьцё. Гарсаветы да гэтага часу ня ўжылі дастатковых захадаў да перабудовы работы каапэрацыі ў адпаведнасьці з задачамі, пастаўленымі перад ёй рашэньнямі XVI зьезду УсеКП(б).

Х. Х.

Апартуністаў і прымірэнцаў—вон з гарсавецкіх ладоў!

Лепшых ударнікаў пасылае пралетарыят Менску ў гарсавет

„Саветы ва ўсёй сваёй рабоце павінны далей апярэцца на стварыўшыйся ўжо новы масавы актыў, перш за ўсё ўдарнікаў фабрык і заводаў і калгасьнікаў на вёсцы"

(З пастановы пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Дэпутацкія мандаты—лепшым рабочым-ударнікам

Калі яўка выбаршчыкаў на справаздачныя сходы Менгарсавету была ня зусім здавальняючая і нават частка справаздачных сходаў сарвалася, дык гэтага нельга сказаць адносна правядзеньня першых выбарчых сходаў.

Першыя выбарчыя сходы гарсавету на прадпрыемствах г. Менску даюць вельмі добрыя вынікі. Сходы праходзяць вельмі актыўна, рабочыя выбаршчыкі амаль поўнасьцю зьяўляюцца на выбары. Рабочыя заводаў «Энэргія», «Бальшавік» і «Комунар» на ўсе сто процантаў зьявіліся на выбарчыя сходы.

Выбарчыя сходы праходзяць пад лёзунгамі ўзьвяшчэньня ролі саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі, узмацненьня сувязі гарсавету з прадпрыемствамі, узьвяшчэньня ролі гарсавету ў барацьбе за прамфінплян, за ажыцьцяўленьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

На сходах рабочыя выбаршчыкі ўнесьлі шмат прапаноў у наказ новаму складу гарсавету. Рабочыя друкарні імя Сталіна ўнесьлі 400 прапаноў, завод «Бальшавік» 40 прапаноў, завод «Полымя Рэвалюцыі»—30 і рымарнай фабрыкі—20 і г. д.

Рабочыя Эльводу ў сваім наказе новаму складу гарсавету прапанавалі: дапамагчы выкананьню пяцігодкі ў чатыры гады; павярнуць гарсавет тварам да вытворчасьці; стаць на чале актыўнасьці мас; няўхільна ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі і ленінскую нацыянальную палітыку; у 1931 г. забраваць экранныя вуліцы; фарсаваць будаўніцтва фабрыкі-кухні; прыступіць да пабудовы новага хлебазаводу; павялічыць колькасьць трамвайных вагонаў.

Чырвона-Штандартны завод «Бальшавік» у наказе новаму складу гарсавету адзначыў неабходнасьць перабудаваць работу гарадзкога савету, узьняць яго ролю ў правядзеньні генэральнай лініі партыі, павярнуць гарсавет тварам да заводу, да прамфінпляну і г. д.

Завод «Полымя Рэвалюцыі» патрабаваў: пабудаваць дом адпачынку для ўдарнікаў; адкрыць начны санаторый для хворых на сухоты; прыстасаваць памяшканьне сынагог на Чырвона-Слабодзкай вул. пад культурныя ўстановы.

Рабочыя рымарнай фабрыкі ў сваіх дадатках да наказу гарсавету адзначылі неабходнасьць узмацненьня тэмпаў жыльлёвага будаўніцтва ў адпаведнасьці з ростам прамысловасьці, узмацніць кантроль над разьмеркаваньнем кватэр у дамох жакстаў і ўнесьлі рад прапаноў, прысьвечаных палепшаньню рабочага забясьпячэньня і дабрабыту акраін.

Кожны пункт наказу гарсавету ўважліва абгаворваўся выбаршчыкамі.

Шмат лепшых ударнікаў у час выбарчых сходаў надалі заявы аб прыёме іх у Камуністычную партыю і Кам самол.

У часе выбарчага сходу на заводзе «Полымя Рэвалюцыі» 6 рабочых абвясьцілі сябе ўдарнай брыгадай імя гарадзкога савету. Рабочыя заводу «Энэргія», дзе за асобны квартал прамфінплян быў выкананы на 100,4 проц. заявілі на выбарчым сходзе, што яны ні ў якім разе не паслабяць узятых тэмпаў і перавыканаюць прамфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Даючы наказ новаму складу гарсавету ўсямерна змагацца за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны рабочыя заводу «Энэргія» настаналі ад прапаваць 4 гадзіны ў карысьць дырыжаблябудаўніцтва і вылілілі на спаборніцтва ўсе заводы Мэталяаб'яднаньня БССР.

Рабочыя Менскіх прадпрыемстваў паслалі дэпутатамі ў гарсавет лепшых ударнікаў.

— Дэпутацкія мандаты даць лепшым з лепшых—вось агульная думка выбарчых сходаў.

Працоўныя Менску абіраюць такі савет, які зьявіцца ў сваёй практычнай дзейнасьці сапраўдным правадніком генэральнай лініі партыі, сапраўды стане на чале і будзе кіраваць з усё ўзрастаючай актыўнасьцю працоўных мас гораду, будзе актыўна змагацца за прамфінплян, за выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

М. П.

Работа Шклоўскага гарсавету нездавальняючая

Справаздачна-перавыбарчая кампанія Шклоўскага гарсавету распачалася са спазьненьнем. Першыя выбарчыя сходы пачаты на фабрыцы «Спартак» з 18-га студзеня. Работа гарсавету пад пала пад жорсткую рабочую крытыку. У сваіх выступленьнях выбаршчыкі ўталі пастанову РВК аб зьняцьці з пасады старшыні гарсавету, ён-жа старшыня выбарчай камісіі, Грабенькава за праяўленьне правапартыўнасьцінай практыкі ў рабоце.

Са справаздачы відаць, што прэзыдыум гарсавету не мабілізаваў грамадзкасьць вакол работы гарсавету, у сэкцыі ня ўцягнуты ўсе члены гарсавета. У выніку гэтага, з 7 сэкцый ніводная як належыць не працавала.

Вось што гавораць аб рабоце фінансавай сэкцыі член гарсавету рабочы Грамакоўскі: «работа фінансавай сэкцыі павінна была быць шырока раз горнута, але ня ведаю ці зьбіралася хсць два разы члены гэтай сэкцыі. Я жадаў працаваць, але мяне ня выклікалі». Тав. Паборцаў адзначае: «Кепска тое што члены гарсавету нам не рабілі справаздач аб сваёй рабоце ў гарсавеце. Мы не маглі рэагаваць на розныя недахопы ў рабоце гарсавету. Дамы муніцыпалізаваны, але гарсавет ня цікавіўся, хто там жыве.

Пасьля шырокага абгаварэньня рабочыя прызналі работу гарсавету нездавальняючай. У склад гарсавету абралі лепшых ударнікаў-рабочых, якія будуць здольны праводзіць генэральную лінію партыі.

Г. Шумілаў.

Апартуністычны дакумант Слуцкага гарсавету

У справаздачы Слуцкага гарсавету, зусім нічога ня сказана пра клясавую барацьбу ў раёне. У справаздачы таксама не адзначана ліквідацыя кулацтва як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі. Вышалі з справаздачы і канкрэтныя прапановы правага апартуністу ў рабоце паасобных аддзелаў і сэкцый Слуцкага гарсавету.

Слуцкі гарсавет, ня прыняўшы гэта пад увагу, у мясцовай газэце «Ленінскі Шлях»,—у сваёй справаздачы нічога не сказаў пра барацьбу з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыёмакратызмам. Нічога ня сказана і пра барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе і шавінізмамі іншых кодераў.

Вузлавое пытаньне—работа каапэрацыі і рабочае забясьпячэньне абойдзены маўчаньнем. Работу каапэрацыі гарсавет ня ведае і ў сваёй справаздачы абмяжоўваецца агульнымі ўстаноўкамі: «За справаздачны перыяд мы сустракалі і сустракаем зараз рад труднасьцяй у галіне забясьпячэньня рабочых і працоўных мас прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі, зьвязанымі з нашым сацыялістычным ростам...» А як працавала каапэрацыя, якія меры прыняты былі з боку гарсавету па мабілізацыі савецкай грамадзкасьці, па дапамозе каапэрацыі.—у справаздачы гарсавету няма ніводнага слова. І гэта ў той час, калі абсьледваньнем каапэрацыі КК-РСІ ўстаноўлена, што ў рабоце каапэрацыі ня было сталага пляну разьмеркаваньня прамтавараў і прадуктаў харчаваньня па крамах гарспажыўтаварыства, як і ня было дакладнага вучоту пайшчыкаў тавары ства, што давала магчымасьць крамнікам займацца самазабясьпячэньнем. Ня лепшая справа і з грамадзкім харчаваньнем.

У рабоце самога гарсавету быў таксама значныя недахопы. З шасьці сэкцый гарсавету, чатыры зусім не працавалі. Камунальная сэкцыя, якая ў 1929 г. на Ўсебеларускім конкурсе па агляду сэкцый гарсаветаў атрымала прэмію за добрую работу, у апошні час зусім спыніла сваю работу. Сэкцыя аховы здароўя каапэрацыйна-гандлёвая сэкцыя таксама бязьдзейнічалі. Адсутнасьць работы ў сэкцыях гарсавет у сваёй справаздачы тлумачыць «аб'ектыўнымі» прычынамі: цякучасьцю членаў сэкцый. Гарсавет ня змог самакрытычна, па бальшавіцку прызнаць віною прарываў у работах сэкцый адсутнасьць кіраўніцтва з боку прэзыдыуму гарсавету.

У справаздачы маюцца і іншыя апартуністычныя пэрлы.

Райкому партыі трэба бязьлітасна ўдарыць па гэткіх складальніках. Справаздачу Слуцкага гарсавету трэба выправіць.

Б. Быхаўскі.
А. Русецкі.

Перавыбары гарсавету закончваем з посьпехам

Да перавыбараў Полацкага Гарсавету падрыхтоўка была праведзена здавальняюча, у выніку чаго перавыбары праходзяць пасьпяхова.

Саюзы мэталістаў, друкароў, асьветнікаў і камунальнікаў далі стопроцантную яўку выбаршчыкаў на перавыбарчыя сходы. Па іншых прафсаюзах гораду процант яўкі хістаецца паміж 80 і 98 проц.

У часе перавыбарчых сходаў па ўсіх саюзах працавалі дзіцячыя ясьлі і ляцоўкі.

Перавыбарчыя сходы праходзяць пад знакам шырокай крытыкі і самакрытыкі. Да выпрацаванага наказу дадаецца шмат дадаткаў, якія датычацца будаўніцтва па горадзе і палепшаньня дабрабыту працоўных гораду.

Харчавікі на сваім сходзе, прысьвечаным перавыбарам, дадаткова ўнесьлі ў наказ Гарсавету прапанову аб тым, каб замест помніка вызваленьня г. Полацку ад французаў пабудаваць помнік Леніну. Гэтая прапанова падтрымана і на сходах іншых саюзаў.

У новы склад Гарсавету абіраюцца лепшыя ўдарнікі. Ня было ніводнага сходу, дзе-б кандыдатуры, якія рэлі сходу партыйная ячэйкі правальваліся. Толькі на сходзе саматужнікаў было два выпадкі варожых выступленьняў накіраваных на кампрамэтаваньне кандыдатур у дэпутаты выстаўленых партыйнай ячэйкай, але гэтым выступленьням выбаршчыкі далі жорсткі адпор.

Перавыбары Полацкага гарсавету заканчваюцца пасьпяхова.

Баз. Румянец.

Мясазагатоўкі—на баявыя тэмпы!

Апартуністычная бязьдзейнасьць пануе на мясазагатоўчым фронце: за першую дэкаду студзеня заданьне выканана на 9,2%

Баркавіцкі, Барысаўскі, Клімавіцкі і Полацкі р-ны яшчэ не пачалі мясазагатовак. Раўняцца па Бешанковіцкім раёне, які выканаў студзеньскае заданьне на 73,3 проц.

Стаць на чале мясазагатовак

Мацней нац'ціснуць на кулака

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) катэгарычна прапанаваў да 1 кастрычніка г. г. выканаць гадавы план жывёлазагатовак на 70 проц.

З мэтаю пасьпяховага вырашэньня гэтай задачы той-жа пленум зазначыў на неабходнасьць рашучай перабудовы работы адпаведных органаў і ў першую чаргу ў сыстэме «Саюзмяса». Гэта перабудова павінна быць накіравана ў бок перанясьненьня ў практыку мясазагатовак і выпрабаваных мэтадаў хлебазагатовак, на выгнаньне з загатоўчых органаў чужых, варожых, шкодніцкіх элементаў і правядзеньня непрымірымай барацьбы з апартуністамі ў практыцы загатовак.

ЦК КП(б)Б, СНК БССР на падставе паказаньняў пленуму прыняў адпаведныя рашэньні, у якіх дакладна паказаў на неабходнасьць паскореньня загатовак. Аднак у асобным квартале па БССР заданьне гадавога пляну выканана на 12 проц. Гэта значыць, што за бягучы квартал трэба выкінуць 58 проц. для таго, каб правесьці ў жыцьцё паказаную дырэктыву пленуму ЦК і ЦКК.

Да 10 сьнежня 1930 г. жывёлазагатоўкі праводзіліся ў сваёй асноўнай шляхам рыначных закупак. Такі мэтад загатовак не адпавядае асноўным устаноўкам. Асноўны і новы гаспадарча-палітычны зьмест бягучых жывёлазагатовак заключаецца ў тым, што яны павінны адрозьнівацца ад старых—пераважна рыначных мэтадаў, і праводзіцца ў парадку давядзеньня пляну да паселішчаў на асновах цьвёрдага прыдзяленьня клясавага прынцыпу.

Другою асаблівасьцю жывёлазагатовак на новых асновах зьяўляецца камплектаваньне статку сацэктару, якое павінна праводзіцца ў парадку агульнага і адзінага пляну жывёлазагатовак.

Па агульным ходзе жывёлазагатовак па БССР нельга яшчэ ў даны момант канстатаваць нарастаньне тэмпаў выкананьня плянавых заданьняў. Поруч з вызначнай часткай раёнаў, у якіх больш-менш здавальняюча разгортваюцца тэмпы выкананьня, асноўная маса раёнаў яшчэ не пераключылася як сьлед на новыя мэтады работы.

Многія раёны паогул мала зрабілі ў правядзеньні жывёлазагатовак. У некаторых раёнах заместь дзелавой работы назіраюцца выпадкі дыкусіі вакол пляну, асабліва ў частцы сьнеязагатовак. Кулак скарыстоўвае і разьвівае гэтыя шкодныя настроі. Ня дыскусія вакол пляну, а выкананьне пляну—вось задача дня.

Асноўнай прычынай сёння нізкіх тэмпаў загатовак зьяўляецца слабая мабілізацыя на выкананьне пляну вясковай грамадзкасьці ў асобе калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас. Райкомы і райвыканкомы павінны неадкладна разгарнуць работу для таго, каб давесьці да паселішчаў пляны выкананьня на аснове шырокага ўдзелу вясковай грамадзкасьці.

З асаблівай увагай і рашучасьцю павінны быць давядзены цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможнага двара. Бадай што ўсюды па БССР у даны момант пляны давядзены да паселішчаў, адкуль пачынаецца асноўная і найбольш адказная работа. З гэтае прычыны райкомы партыі і райвыканкомы на месцах практычна на справе дапамагчы сельсаветам канчаткова разьмеркаваць плянавыя заданьні, не дапушчаючы перакладваньня гэтай работы цалкам і поўнасьцю на сельсаветы. Назіраюцца недапушчальныя выпадкі, калі райвыканкомы замест непатрэбнага давядзеньня пляну загатовак да калгасаў ускладаюць гэтую работу на сельсаветы. Трэба змагацца з маюнымися на практыцы тэндэнцыямі, калі сельсаветы таксама скідаюць з сябе асноўны цяжар работы і перакладваюць яго на камісіі садзейнічаньня.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі, а таксама і іх цэнтральныя органы—Белкаапсаюз і Белмаслажывёлаводсаюз—да гэтага часу не перабудаваліся ў работе.

Камплектаваньне статку сацэктару—надзвычайна важная задача агульнай справы мясазагатовак. Трэба цьвёрда прытрымацца пляну камплектаваньня і не дапушчаць перавышэньня яго за кошт пляну мясазабясьпячэньня. У цэлым камплектаваньне праходзіць самацёкам з радам самых сур'ёзных недахопаў. Часта ня мясцох, замест барацьбы з труднасьцямі камплектаваньня, ідуць на лёгкі найменшага супраціўленьня. Неарганізаванасьць адбору на працягу трох дзён пасьля паступленьня прадукцыйнай жывёлы на базу прыводзіць да таго, што яна замест камплектаваньня ідзе на ўбой.

Апарат Белмяса яшчэ дастаткова не ўзмацніўся і ня мае па сутнасьці ні выразнасьці, ні плянавасьці ў сваёй рабоце і часта дзейнічае саматужна.

Зараз жывёлазагатоўкі ўступілі ў такую паласу, калі на мясцох узьнікае рад запросаў і цяжкасьцяй. А між тым, сувязь з месцамі, інструктаж, праверка работы, вучот і абагульненьне даных праводзіцца ў апараце Белмяса ў вельмі значнай ступені без сыстэмы і далёка ня поўна.

Пры гэтых недахопах, Белмяса нават не правяло нарады загатоўчыкаў яго адзяленьняў на мясцох у той час, калі менна гэтая група працаўнікоў павінна быць непасрэдным дзейнічаючай сілай у жывёлазагатоўках.

Не зважаючы на неаднаразовыя рашэньні ЦК КП(б)Б, большасьць райкомаў партыі да гэтага часу не ўзмацняюць жывой сеткі Белмяса добрымі працаўнікамі і не правяраюць іх работы. Характарна пры гэтым адзначыць, што да гэтага часу няма вестак аб тым, каб райкомы ставілі справаздачныя даклады загатоўчыкаў адзяленьняў Белмяса. У сувязі з гэтым узмацненьне апарату Белмяса на мясцох і праверка яго зьяўляюцца неадкладнай задачай райкомаў, а таксама і райвыканкомаў.

Камісія па чыстцы апарату Белмяса, якая зараз працуе, павінна ў сувязі з гэтым зьвярнуць асаблівую ўвагу на кадры і на работу Белмяса і неадкладна прыняць адпаведныя меры.

Жывёлазагатоўкі ўзмацняюць наступ на кулака. Адпаведныя органы павінны пільна сачыць за ходам жывёлазагатовак і дзейнасьцю мясной прамысловасьці, бязьлітасна змагаючыся з чужымі, варожа-шкодніцкімі элементамі. Асаблівую ўвагу мясазагатоўкам павінен аддаць увесь наш друк, які дарэчы да гэтага часу мала надаваў увагі.

Загатоўчыя арганізацыі павінны пашырыцца да прыёму вялікіх партый жывёлы.

Толькі на аснове цьвёрдага правядзеньня генэральнай лініі партыі ў справе жывёлазагатовак можна вырашыць мясную праблему, як важнейшую гаспадарча-палітычную задачу.

Бараноўскі.

Патрэбен рашучы пералом

Паводле вестак Белмяса, за першую дэкаду студзеня месячны план мясазагатовак, выканан толькі на 9,2 проц. прычым толькі Бешанковіцкі раён выканаў заданьне на 73,3 проц., а ўсе іншыя раёны ганебна адсталі.

Так, Самахвалавіцкі, Касьцюковіцкі, Лепьчыцкі, Лупалеўскі, Талочынскі, Дубровенскі, Грэскі, Глускі, Быхаўскі, Асьвейскі, Аршанскі і Вушацкі раёны ня выканалі і 3-х процантаў заданьня.

Адкормачны пункт без вэтнагляду

На адкормачным пункце пры Каптаркевіцкім аддзяленьні Белмяса часта хварэе жывёла; дэпутата-ветэрынара ва ўсім раёне няма. Не зважаючы на паказаньні, аб тым, што без ветэрынарнага агляду адгружаць жывёлы для мясазагатовак; Барковіцкі, Барысаўскі, Буда-Кашалёўскі, Каралінскі, Клімавіцкі, Лагойскі, Церахоўскі, Полацкі, Сьвіслацкі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Чаўсрскі і Горацкі раёны—нават не пачыналі брацца за загатоўкі мяса. Гэта сьведчыць аб нядбайных адносінах да загатовак. Патрэбен рашучы пералом. Заданьне па мясу павінна быць выканана.

Апартуністы спадзяюцца на самацёк

КУЛАКАМ НЯ ДАДЗЕНА ЦЬВЁРДАГА ЗАДАНЬНЯ.

Плян мясазагатовак у Горацкім раёне ў цэлым радзе сельсаветаў, яшчэ не даведзены да кулацкага двара і паасобных паселішчаў. РВК невыстарчальна кіруе гэтай выключна палітычна-важнай кампаніяй. Паасобныя працаўнікі, якія выяжджаюць у сельсавет, не прымаюць рашучых захадаў у гэтым кірунку.

Сельсаветы Панкратаўскі, Вацялеўскі і інш. зусім не займаюцца выканаўчым пляну мясазагатовак, спасылаючыся на тое, што зараз трэба праводзіць справаздачна-перавыбарчую кампанію саветаў і ім няма часу займацца гэтай «дробязьзю». Некаторыя сельсаветы заяўляюць, што ў іх кулакоў няма.

Неабходна ўжыць тэрміновыя захады, бо плян мясазагатовак у Горацкім раёне знаходзіцца пад пагрозаю зрыву. Трэба рашуча ўдарыць па правапартыўнасьцінай практыцы ў правядзеньні мясазагатовак у радзе сельсаветаў Горацкага раёну.

Дзед Авей.

Скараціць выдаткі

З вёскі Скрыгалава, Петрыкаўскага раёну, гоняць жывёлу здаваць на мяса ў Петрыкаў у той час, калі можна здаць яе на ст. Пінч, Капаткевіцкаму загатоўчаму аддзяленьню, адкуль жывёла грузіцца ў вагоны. Гэта дасьць эканомію сродкаў, а жывёла ня будзе траціць сваёй вагі пры перагонах.

К.

Папярэдзіць перагібы

Нядайскаму сельсавету, Буда-Кашалёўскага р-ну было дадзена заданьне па мясазагатоўках. Атрымаўшы заданьне сельсавет пачаў зараз-жа даваць цьвёрдыя заданьні сераднякам гаспадаркам. Між тым некаторыя сапраўды кулацкія гаспадаркі сельсавет абмінуў.

Ул. Бойчанка.

Пакуль толькі на паперы

(Завод «Бальшавік»).

Становішча ваеннай работы на гарбарні «Бальшавік» зусім нездавальняючае. У «дэкаду абароны» былі некаторы зрух, але ён на замацаваны. На заводзе няма пляну вайсковых заняткаў. Аб «вайсковым дні» ня ўсе рабочыя ведаюць.

З вызначаных за сьнежань і першую палову студзеня 4-х заняткаў адбылося толькі адно. Пры ячэйцы ТДА-Авіяхэму арганізаваны гурткі па вывучэньні кавалерыйскай і артылерыйскай справы, але-ж заняткі гэтых гурткоў у большасьці зрываюцца. Аб вярбоўцы ў вайсковыя школы моладзь заводу ня ведае.

Паколькі вайсковая работа ў заняпадзе няма і росту ячэйкі ТДА-Авіяхэму.

Газэта «Рабочае Вока» пытаньнямі вайсковай работы не займаецца.

З боку партыйнай арганізацыі і заўкому дапамога ячэйцы ТДА-Авіяхэму адсутнічае. Аб гэтым сьведчыць наступны факт: калі сакратар ячэйкі ТДА-Авіяхэму аддаў ў заўком надрукаваць у некалькіх экз. рапарт аб стане вайсковай работы на заводзе, дык рапарт недзе зьнік.

Ларычаў, Пінчук.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Апарат сувязі на аглядзе

Рэйдам брыгад газэты „Савецкая Беларусь" па г. Менску выкрыты:

Ігнараваньне супрацоўнікамі апарату сувязі дырэктыў партыі і ўраду па беларусізацыі апарату,

злачынна-нядбайныя адносіны лістаносцаў да дастаўкі карэспандэнцыі адрасатам,

выпадкі безгаспадарчасьці і фармальна-чыноўніцкі падыход да кліентуры

Беларускае Кіраўніцтва Сувязі безадкладна павінна выправіць маючыяся недахопы ў рабоце апарату сувязі

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

ПА ДАКЛАДУ УПАЎНАВАЖАНАГА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПОШТ І ТЭЛЕГРАФАЎ АБ СТАНОВІШЧЫ СУВЯЗІ З РАЁНАМІ.

Заслухаўшы даклад намесьніка Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў тав. Каменева аб становішчы і перспэктывах будаўніцтва сувязі на 1931 г. у БССР Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць, што становішча і работа ўсіх відаў сувязі БССР не адпавядае запатрабаваньням шпарка узрастаючага сацыялістычнага будаўніцтва, рэканструкцыі сельскае гаспадкарі, а таксама і культурным запатрабаваньням працоўных мас, асабліва пасьля ліквідацыі округ і пераходу на раённую сыстэму кіраўніцтва.

2. Ухваліць мерапрыемствы Упаўнаважанага Наркампаштэля па будаўніцтву сувязі, накіраваныя на тое, каб на працягу 1931 году зьвязаць усе раёны тэлеграфнай і тэлефоннай сувязьзю і сельсаветы—тэлефоннай сувязьзю.

3. Лічыць неабходным у найкарацейшы тэрмін устанавіць радыё-сувязь з усімі раёнамі забясьпечыўшы гэтую радыё-сувязь адпаведнымі пітацельнымі станцыямі а таксама адпаведным інструктажам.

4. Прыняць да ведама паведамленьне тав. Каменева аб тым што да раённых цэнтраў пошта развозіцца кожны дзень.

5. Падтрымаць хадайнічаньне Упаўнаважанага Наркампаштэля перад Народным Камісарыятам Пошт і Тэлеграфаў Саюзу ССР аб водпуску для палепшаньня сувязі ў БССР матар'яльных сродкаў абсатаяваньня і г. д.

6. Усклаць мерапрыемствы Упаўнаважанага Наркампаштэля па падрыхтоўцы кадраў сувязі. Даручыць Народнаму камісарыяту асьветы разам з Упаўнаважаным Наркампаштэля ў бліжэйшы тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечвалі выкананьне пляну па падрыхтоўцы кадраў сувязі ў БССР. (арганізацыя тэхнікумаў і г. д.).

7. Даручыць райвыканкомам і сельсветам зьвярнуць увагу на сталае кіраўніцтва работай аддзялаў сувязі на мясцох. Прыцягнуць працаўнікоў сувязі да агульнай савецка-грамадзкай работы, вылучаючы працаўнікоў сувязі ў склад кіруючых органаў райвыканкомаў, сельсаветаў і г. д.

8. Лічыць неабходным пры вызначэньні мерапрыемстваў па палепшаньні добрабыту даткароў, атрыманьні ўзнагароды, ацэнцы і г. д. улічыць таксама і патрэбы працаўнікоў сувязі.

9. Прыняць да ведама заяву тав. Каменева аб тым, што несваячасовая дастаўка газэт у шэрагу выпадкаў тлумачыцца несваячасовым выпускам гэтых газэт адпаведнымі рэдакцыямі і друкарнямі. Зьвярнуць увагу Упаўнаважанага Наркампаштэля на неабходнасьць удакладненьня справы дастаўкі і распаўсюджваньня газэт апаратам Сувязі.

10. Маючы на ўвазе, што плянавае снабжэньне спэцвопраткай прадпрыемствам сувязі БССР вытвараецца надзвычайна келска, прапанаваць Наркамгандлю БССР прыняць тэрміновыя меры да поўнага і своечасовага снабжэньня спэцвопраткай асобных груп рабочых і служачых сувязі.

11. Да сканчэньня перабудовы Менскай тэлефоннай станцыі, лічыць неабходным устанавіць у г. Менску дадатковую падстанцыю на 600 нумароў, абчым прапанаваць Беларускаму Кіраўніцтву Сувязі паставіць пытаньне перад Народным Камісарыятам Пошт і Тэлеграфаў Саюзу ССР.

12. Прапанаваць Упаўнаважанаму Наркампаштэля прыняць меры да ўстанаўленьня да 1-га лістапада 1931 г. бесьперабойнай радыё-сувязі з раёнамі па прыёму загадаў і інфармацый, перадаваемых з Менску.

13. Прапанаваць усім райвыканкомам забясьпечыць нармальную перавозку пошт на дагаворных пачатках з раённымі аддзеламі сувязі.

14. Даручыць Савету Народных Камісараў у тэрміновым парадку разглядзець усе заяўкі Упаўнаважанага Наркампаштэля на слупы, дрот і інш у мэтах дачы паказаньняў адпаведным органам БССР, у прыватнасьці Леспрамгасу, аб забясьпечаньні органаў Сувязі гэтымі матар'ялам, а таксама зьяўнуць пытаньне перад Саюзнымі органамі аб водпуску тых матар'ялаў якія адсутнічаюць у БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

25 сьнежня 1930 г.
г. Менск.

Рашуча аздаравіць работу менскай канторы сувязі

Менская галоўная паштова-тэлеграфная кантора ня можа зьяўляцца ўзорам работы для іншых паштовых кантор. У паасобных аддзелах і зьвеньнях работы кантор ёсьць шмат недахопаў. Брыгадай газэты «Савецкая Беларусь» пры наёце на кантору 17 студзеня выкрыты цэлы рад ненармальнасьцей як у рабоце ўсяе канторы, так і паасобных яе супрацоўнікаў.

Беларусізацыю абыходзяць

У апэрацыйным пакоі канторы брыгадзе ўдалося пазнаёміцца з абслугоўваньнем працоўнага насельніцтва як даведачным бюро, ашчадкасай і аддзеламі выдачы і прёму грашовых пераводаў, так і аддзеламі прыёму і выдачы заказной карэспандэнцыі продажу паштовых знакаў аплаты.

Трэба адзначыць, што калі т. Каціна (аддзел заказной карэспандэнцыі) ветліва і Грымава (служба даведак) добра і без затрыманьня абслугоўвалі кліентуру, дык у рабоце т. Елінай (аддзел продажу паштовых знакаў аплаты) да наведвальнікаў назіраецца фармальна-чыноўніцкі падыход. У часе налёту брыгады быў выпадак, калі работніца сталовай Камунзу т. Бразінская на працягу 10 хв. не магла купіць паштовых двух дзесяціканеечных марак толькі таму, што т. Еліна чакала пакуль адна наведвальніца падлічвала колькі ёй магчыма купіць пасылачных дэкларацый за маючыяся ў яе грошы.

Тут-жа быў заўважаны нашай брыгадай выпадак, калі т. Еліна была тутаркі прыватнага парадку з супрацоўнікамі канторы, а кліентура чакала.

У ашчадкасе ў самы разгар апэрацый касы на працягу 30 хв. (ад 12 г. да 12 г. 30 хвілін) ня было кантролёра т. Гуза. А ў гэты час значная чарга кліентуры нэрвова чакала яго прыходу, лаючы паміж сабой «парадкі» Ашчадкасы.

Нічога ня варта пастаўлена ў апэрацыйным пакоі справа з ачысткай паштовай скрынкі. Па абвестцы на сьцяне пакою было відаць, што ачыстка скрыні праводзіцца а 8, 10, 12 гадзіне раніцы і г. д. Але-ж на зьлікі жаль пост-брыгадзір каля скрынкі заўважыў, што з 11 г. 48 хв. да 1-й гадзіны дню паштовая скрынка зусім не ачышчалася. І калі ў аддзеле гарадзкой дастаўкі карэспандэнцыі брыгадзірам удалося адшукаць лістаносца т. Ашмянскую, якая праводзіць ачыстку скрынкі, дык на запытаньне «калі вамі робіцца выемка лістоў з паштовай скрынкі апэрацыйнага пакою», пачуўся вельмі «прыемны» адказ: «ачышчаю тады, калі тут (чытай у гарадзкім аддзеле карэспандэнцыі) няма чаго рабіць».

У рабоце назіраецца поўнае ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду па беларусізацыі апарату. Беларуская мова як пры службовых размовах, так і пры абслугоўваньні кліентуры ніводным з супрацоўнікаў ня ўжываецца і ўся работа вядзецца на расійскай мове, што ні з боку адміністрацыі, ні з боку мясцкому і парткалектыву не зьвяртаецца ніякай увагі.

Аб пасылках, позвах і галавацяпстве...

Шмат скаргаў ад кліентуры маецца на работу аддзелу выдачы пасылак. І зусім зразумела. Позвы на пасылкі лістаносцамі дастаўляюцца ацёпна, ня лепш і выпісваюцца ў позвах і адрасы кліентаў. Ад гэтага пасылкі значны час пралежваюць у кладовых аддзелу, а потым за «захаваньне» з кліента бяруцца грошы, ня гледзячы на тое, што віна ў гэтым не яго. Пасылка гр. Поляка праляжала каля 10 дзён не атрыманай толькі таму, што супрацоўнікам пасылачнага аддзелу т. Семашка позва Полыку была выпісана бяз вызначэньня вуліцы і № дому. Лістаносец вымушаны быў запытвацца сярэдны стол гарадзкой міліцыі аб месцазнаходжаньні гр. Поляка. Гэтае шуканьне цягнулася больш 6 дзён, а гр. Полык, атрымаўшы паўторную позву на... дзесяты дзень, забраў пасылку, заплаціўшы за «захаваньне».

Аналёгічнае зьявішча і з затрыманьнем пасылкі было і ў гр. Галавацкага (Нова-Маскоўская вул.). У кладовай пры беглым пераглядзе пасылак брыгадай заўважана шмат пасылак, якія ляжаць звыш 20 дзён недастаўленыя. У аддзеле прыёму пасылак быў выпадак, калі ад курсанта АБВШ тав. Падмазава работнікі аддзелу адмовіліся прыняць пасылку тлумачачы тым, што «зараз ідзе прыём казённых пасылак».

Дрэнна дастаўляюць карэспандэнцыю

Вельмі дрэнна ў Менскай Канторы лістаносцамі дастаўляецца на дом карэспандэнцыя. Пры выпадковым агляде сумак лістаносцаў, у сумцы тав. Банкецка знойдзены на імя М. Вайнштэйн (Нова-Маскоўская вул.) паштовы ліст, які з 29-12-30 г. ня быў дастаўлены адрэсату. У даведачным бюро прышлося выпадкова прысутнічаць, калі гр-н Галавацкі (Нова-Маскоўская вул.) скардзіўся на тое, што лістаносец Банкецк газэты, лісты і часопісі кідае на падлогу. Паведамленьне Наркампрацы ад 13-І, за № 396 на імя Акц. Т-ва Дамбуду, аб прадстаўленьні да 16-І зьвестак аб колькасьці рабочых і... 17-І-31 г. спакойна ляжала ў сумцы лістаноса, які абслугоўвае Ленінскую вуліцу.

Ня лепш і Канторы абстаіць справа і з адпраўкай карэспандэнцыі на ст. Менск у паштовыя вагоны. Паштовыя аўтамабілі адпраўляюцца з спазьненьнем. У час налёту брыгады паштовы аўтамабіль на паштовы вагон поезда № 72 (на Маскву) яшчэ і ў дзьве тадзіны 30 хв. дня ня быў адпраўлены, у той час як адпраўка аўтамабілю ўтвараецца ў 2 гадз. дня. Ня гледзячы на тое, што для накрываньня карэспандэнцыі ў Канторы маецца брэзент, паштовыя аўтамабілі развозяць лісты, газэты і інш. не пакрытымі.

Значным недахопам зьяўляецца тут тое, што ў кіёску пры Канторы зусім няма вайсковай літаратуры. Дрэнна тут справа і з насьцендрукам, а таксама асьвятленьнем ходу трохмесячніка агляду апарату сувязі. Насьцендрук зусім не адбівае недахопаў работы паасобных аддзелаў Канторы і паасобных яе работнікаў. Няма ў насьценгазэтах «Сувязь» ніводнага слова пра трохмесячнік агляду апарату сувязі. Работнікі Канторы вакол гэтага пытаньня не мабілізаваны і пра агляд гаспытаркі сувязі нічога ня ведаюць.

Брыгада газ. «Сав. Беларусь»
Лысенка, Назарэнка, Биляеў.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра аслабаненьне тав. Сташэўскага А. Я, ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Аслабаніць тав. Сташэўскага Аляксандра Язэпавіча, ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

23 студзеня 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра аслабаненьне тав. Валасевіча П. І. ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Юстыцыі і Старшыні Вярхоўнага Суду БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Аслабаніць тав. Валасевіча, Паўла Іванавіча, ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Юстыцыі і Старшыні Вярхоўнага Суду БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

23 студзеня 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра назначэньне тав. Ляўкова М. А. Народным Камісарам Юстыцыі БССР і Пракурорам Рэспублікі.

Прэзыдум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Ляўкова, Максыма Архіпавіча, Народным Камісарам Юстыцыі БССР і Пракурорам Рэспублікі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

23 студзеня 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра аслабаненьне тав. Ліўшица Д. У. ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Аховы Здароўя БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Аслабаніць тав. Ліўшица, Давіда Уладзіміравіча, ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Аховы Здароўя БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

23 студзеня 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра назначэньне тав. Кроля Я. М. Намесьнікам Народнага Камісара Юстыцыі і Старшынёй Вярхоўнага Суду БССР.

Прэзыдум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Кроля, Яўхіма Майсеевіча, Намесьнікам Народнага Камісара Юстыцыі і Старшынёй Вярхоўнага Суду БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

23 студзеня 1931 г.
гор. Менск.

Зьнішчыць недахопы

Праходзячы месячнік беларусізацыі по закамуў шэрагу ўстаноў м-ка Старыя Дарогі. У беларускай сямігодцы васпізацыя, матаматыка і геаграфія выкладаецца ў большасьці на расійскай мове. Некаторыя вучні, настаўнікі гавораць па расійску. Літаратура ў бібліятэках пры школе і доме культуры ў большай частцы расійская. Беларускіх сучасных кніжак амаль няма. Гурткоў па бел мове пры ШКМ няма.

П. Х.

Паштовая скрынка

Я. Сальцкаму—«Жывёлагадоўля ў загоне»—ваш допіс накіраваны на рассьледваньне Рагачэўскай РСІ. Мунькіцы—«Семінкоў ў калгасе»—Мазырскаму Райкалгассаюзу. А. Крупыне—«Адгароджваюць ад аднаасобнікаў»—Пухавіцкаму Райкалгасаюзу. Смольнаму—«Дрэнна адносяцца да батракоў»—Каралінскаму Райкалгасаюзу. Айбердзкаму—«Гнаць у шыю з калгасаў кулакоў»—Каралінскі РСІ. А. Шынкевічу—«Аздаравіць працу»—Слуцкаму Райкалгассаюзу.

Ясакару—«Няма кіраўніцтва»—Сьвіслацкаму Райкалгассаюзу. Брэгману—«Пра калгас Зорка»—Петрыкаўскаму Райкалгасаюзу. Фядзюшку—«Пра сеяліча лжэўдарных»—Слуцкаму РВК. Калтасьніку—«Палажэньне ў калгасе Міхалоўка»—Брагінскаму Райкалгассаюзу. Верасаку—«Ударыць па рвачоў». К. Белавусаву—«Пераключыцца»—Наркамзем Рачыцкаму. Верасу—«Павольныя тэмпы»—Мазырскаму Райкалгассаюзу. К. Бічу—«На чорную дошку»—Бабруйскаму Райкалгассаюзу. Кружалёву—«Крукаўскія апартуністы»—Камарынскай РКК-РСІ.

Яршову—Калгас «Чырвоная Перамога» накіравана Расонскаму Райкалгассаюзу. Д. Р.—«Колхозу Бальшавік патрэбна дапамога»—Узыдзенскаму РК КП(б)Б. Ул. К.—«Вінаватых ня адказнасьці»—Вярэйскаму РК КП(б)Б. Пулаву—«Патрэбна гнаць такіх з калгасу»—Буда-Кашалёўскай РСІ. Пчале—«Белмяса тармозіць прыёмку жывёлы»—Капаткевіцкай РСІ. Пятому—«Не кіраўніцтва, а шкодніцтва»—Чачэвіцкаму РК КП(б)Б. Верасу—«Дарогу жывёлагадоўлі»—Мазырскаму Райкалгассаюзу.

Я. Ісарагу—«Чаму выкураны Левікаў» — накіраваны Белкалгасцэнтр. Саве—«Коням сьмерць»—Мазырскаму РВК. В. С—ч—«Больш увагі жывёле ў савецкіх і калектыўных гаспадарках»—Барысаўскаму Райкалгассаюзу. М. Піскуну—«Падцягнуць Самахвалаўскі заатэхнікаў» — Сьмілавіцкаму Райкалгассаюзу. Я. Д.—«У жывёлагадоўлі няма зруху»—Сьмілавіцкаму Райкалгассаюзу. Даманоўскаму—«Ня зусім добра» — Багушэўскаму Райкалгассаюзу. М. Сролікаву—«Сьвіньні ў грязі»—Ушарэйскаму Райкалгассаюзу. Герасімевіку—«Паведамленьне»—Нараўлянскаму Райкалгассаюзу.

М. Дзяніленку—«Ні больш, ні менш як антысавецкае выхаваньне»—Барэзінскам, Райвна. Брыгадзіру—«Школьны будынак спалілі на дровы»—Дуброўенскаму РВК. Пацярпеўшаму—«Сабачнік, а ня школа»—Чачэрскаму Райвна. Лявіцкаму—«Ачысьціць школу ад шкодніцкай нацдэмаўскай, антысэмітычнай і іншай школьніцкай літаратуры»—Сьмілавіцкаму Райвна. Асоту—«Пра настаўніка Іванова»—Дуброўнскаму РВК. Савіцкаму—«Затрымліваюць зарплату»—Рагачэўскаму РВК. Зорку—«Лист»—Аршанскаму пэдтэхнікуму, прафкому. Рудакоўскаму—«Бязьлітасны агень на права-левацкаму» апартунізму» — ЦКК-РСІ.

Даронину—аб брыгадзірах—накіравана на Шклоўскаму РВК. Рулкоўскаму—«Савецкая эстафэта»—ЦКК-РСІ.

Вінику—«Тармозіць вучобу»—накіравана Слуцкаму РВК. Асацы і Атаве—«Ачысьціць сельсавет ад брудзу»—Рэчыцкаму РВК. Ведаючаму—аб школе—Кармянскаму РВК.

Асацы—«Прытулак «кулакоў» пасланы Мазырскаму вуч. райпракурору. Свайму—«Самахвалаўшчыкі нарсудзьдзя п'янствуе»—райпракурору. Дзеду Галузе—«І камень на адным месцы абрастае»—Хойніцкаму РВК.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"	Новая гукавая праграма **ПЛЯН ВЯЛІКХ РАБОТ** (пяцігодка) Звыш праграмы 1. 1905 год у буржуазнай сатыры 2. Часопіс № 4-5 Белдзяржкіно Штодзённа 3 сэансы Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.
Кіно-тэатр „Культура"	**„ЖАЛЕЗНЫ АВАНГАРД"** Хроніка Саюзкіно № 70 Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.
Кіно „ТЭРКАЦЫЯНАЛ"	**„ЗЬВЯНО ЭНЭРГЕТЫКІ"** Культур фільм Саюзкіно Пачатак а 6 . Каса ад 4 з пал. гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	**„НАСТУПАЕ ВЯНЕ"** культур-фэльетон Звыш праграмы **ПРЫГАВАР ПРАЛЕТАРЫЯТУ** (пр цэс прамартыі) Пачатак а 6 гадзіне. Каса ад 4 з паловай гадз.
Дзіцячы Кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"	1. **НАХАВАНЬНЕ У. І. ЛЕНІНА** 2. **КАМУНА БАТРАЧАТ** Пачатак а 1-й га зіне Каса з 12.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ХУТКА! ХУТКА! ХУТКА!

Лепшы фільм вытворчасьці Саюзкіно

(кіно-трэсту Белдзяржкіно)

РУБІКОН.

Пры Белканторы Дзяржбанку ў г. Менску

ў першай палове лютага м-цу г. г.

адчыняюцца ПАЎТАРАМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ

для падрыхтоўкі бухгальтароў з рахункаводаў,

маючых 2—3 гадовы стаж рахункавай працы.

Заявы на курсы прымаюцца ў кожным раённым філіале Дзяржбанку, крэдытных таварыствах у Белканторы Дзяржбанку. Да заявы павінен быць прыкладзен працоўны сьпіс.

Скончыўшыя курсы будуць накіраваны на працу ў якасьці бухгалтара ў раённыя філіялы Дзяржбанку і крэдытныя таварыствы і праца-ць там ня менш 2-х год. Усе залічаныя па курсы будуць забясьпечаны 60-75 руб. стыпэндыі і будзе дана кватэра. Да пачатку заняткаў курсаў падаўшыя заявы могуць быць залічаны часова рахункаводамі. У першую чаргу будуць залічаны на курсы рахункаводы раённых аддзяленьняў Дзяржбанку і крэдытных таварыстваў. За ўсімі даведкамі зьвяртацца ў гор. Менску: Дзяржбанк, тэлефон № 272, тав. Сідаровічу; у раёнах да старшыні філіялу Дзяржбанку ці крэдытнага таварыства.

Белканторы Дзяржбанку **ФЭЛЬДМАН, СДАРОВІЧ.**

Да ведама студэнтаў, залічаных на зімовы набор у Менскі Архітэктурна Буд. Тэхнікум.

МЕНСКІ АРХІТЭКТУРНА-БУД. ТЭХНІКУМ

— паведамляе, —

што заняткі 1 курсу зімовага набору АДТЭРМІНОЎВАЮЦЦА на два йшы час. Таму п апаўцца не зьяўляцца ў тэхнікум 16 лютага, а чакаць новага паведамленьня аб пачатку заняткаў.

Адміністрацыя тэхнікуму.

АБВЕСТКА.

З 15 лютага 1931 году

ПРЫ МЕНСКІМ БЕЛПЭДТЭХНІКУМЕ

адчыняюцца кароткатэрміновыя (шасьцімесячныя)

— ПЭДАГАГІЧНЫЯ КУРСЫ —

на базе семігодкі. Прыём заяў да 10 лютага. Заявы падаваць у Белпэдтэхнікум з такімі ж дакумэнтамі, якія патрабуюцца для паступленьня ў тэхнікум.

Дырэктар БПТ АКУЛІК.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прыгавору суда ад 5 сьнежня 1930 г. і арт. 196 з санкцыі 213 К. К., за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Шэршану Льву Ўладзімераву—вінакуру броварнага заводу саўгасу Бярэзіна.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прыгавору суда ад 5 сьнежня 1930 г. і арт. 196 з санкцыі 213 К. К., за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Марцінанісу Савасьцею Міхасёваму, машыністу на заводзе саўгасу Бярэзіна.

Заключны балянс „Белсельхозснаба"

на 1-е кастрычніка 1930 году.

АКТЫЎ

	Прыватная	Агульная	% % да агульнадзяржаўнага
I. Грашовыя сродкі.			
Каса	592—20	592—20	0,02
II. Цэнныя акцыі			
Іншыя	50850 —	50850 —	1,5
III. Тавары			
Тавары на складах	426454—08		
„ зданьня на хаваньне	50—98		
„ у дарозе	41654—42	468164—48	14,0
IV. Матар'ялы і тара	796—32	796—32	0,023
V. Маемасьць			
Будынкі і будаваньне	60829—72		
Інвэнтар і абсталяван.	27027—27	87856—99	2,62
VI. Нескончаны будынкі і капіт. рэмонт	2601—45	2601—45	0,08
VII. Вэксалі і дакум. да атрыман.			
Накладныя плацяжы	16968—52	16968—52	0,487
VIII. Разьлікі з банкам			
Дзяржбанк па кантак. рахунку	1060273—63	1060273—63	31,63
IX. Разьлікі			
Дастаўнікі	217185—52		
Пакупнікі	330044—41		
Розн. устан. і асобы	2939—10	550229—03	16,4
X. Няпэўныя даўгі			
Няпэўн. даўжнікі па адкрыт. рахун.	338—50	338—50	0,01
XI. Не аплачаныя акцыі	1106410 —	1106410 —	33,0
XII. Перадаплачан. сумы			
Перадпраўка прадпр.	664—15		
„ асобы	291—55	955—70	0,03
XIII. Нескончаны апэрацыі			
Перапрацоўка тавараў і камплектн. машын.	5710—45	5710—45	0,2
БАЛЯНС		3351747—27	100
ЗА БАЛЯНСАМ			
Тавары прынятыя на хаваньне	18187—51		—
Вэксалі прыняты да забясьпечэн.	125000 —		—
Розн. устан. і асобы па выдаз. солё вэкс.	45000 —	188187—51	—

ПАСЫЎ

	Прыватная	Агульная	% % да агульнадзяржаўнага
I. Капіталы.			
Асноўны капітал	2500000		
Амартызацыйны капітал	1801—20	2501801—20	74,64
II. Фонды і рэзэрвы.			
Фонд на пакрыцьцё ўбыткаў падлягаюч. узьмяшч.	21587—19		
Рэзэрв на няпэўн. даўгі	338—50	21925—69	0,65
III. НКЗ па матавых адлічэньнях.			
а) Тэхдапамога	25206—05		
б) Мэханізацыя	12776—09	37982—14	1,13
IV. Разьліні.			
Дастаўнікі	58823—02		
Папяр. разьлікі па дастаўцы	132143—8		
Пакупнікі	259081—11		
Рабочыя і служачыя	393—35		
Розн. устан. і асобы	21845—	472285—57	14,1
V. Прыбытак.			
Справаздачны году	228794—79		
Накладныя на тавары	88957—88	317752—67	9,48
БАЛЯНС	—	351747—27	100
ЗА БАЛЯНСАМ			
Дапаўненты па таварах	18187—51		—
Розн. устан. і асобы па атрыманых вэксалях	125000—		—
Солё-вэксалі выданыя па забясьпеч.	45000—	188187—51	—

Старшыня праўленьня ТАЛАПІЛА — Галоўбух РАБІНОВІЧ

Ведамасьць прыбыткаў і страт „БЕЛСЕЛЬХОЗСНАБА"

за 1929-1930 г.

ДЭБЕТ

Найменьне артыкулаў страт	Сума	% % да звароту: Па продажнай цане	% % да звароту: Па сабекошту
1. Агульна-гандлёвыя выдаткі:			
а) Выдаткі Р. 101105—30			
б) Падаткі і зборы „ 143531—59			
в) Амартызац. „ 1801—20			
г) Па рэзэрвным асобам „ 8236—15	254674—24	1,75	1,80
2. Прошанты	93985—02	0,65	0,67
3. Камісійная	488—20	—	—
4. Адлічэньні ў рэзэрв НКЗ	338—50	—	—
5. Розныя выдаткі і страты	2882—79	0,02	0,02
Разам	352368—75	2,42	2,49
Чысты прыбытак	228794—79	—	—
Балянс	581163—54	—	—

КРЭДЫТ

Найменьне артыкулаў прыбыткаў	Сума	%% да звароту: Па продажнай цане	%% да звароту: Па сабекошту
Прыбытак ад продажы тавараў	433265—87	2,99	3,07
Процанты атрыманыя	143686—56	0,98	1,02
Розн. даходы і прыбыткі	4211—11	0,02	0,03
Разам	581163—54	—	—
Балянс	581163—54	3,99	4,12

Старшыня праўленьня ТАЛАПІЛА. — Галоўбух РАБІНОВІЧ.

ПРЭЗЫДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Галоўлітбел 593 ДРУКАРНЯ БДВ ІМЯ тав. СТАЛІНА